This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2020.pp.45-86

Przegląd Środkowo-Wschodni, 5, 2020
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20200502

Data przesłania: 08.04.2019
Data akceptacji: 09.08.2019

**Аляксандр Гужалоўскі**
Гістарычны факультэт
Беларускага дзяржаўнага універсітэта
huzhalouski@gmail.com
ORCID: 0000-0002-9743-8724

# Сталін у беларускай савецкай літаратуры

**Stalin w białoruskiej literaturze sowieckiej**

Artykuł opowiada o utrwalaniu kultu Stalina w literaturze białoruskiej w latach 30. i 50. XX. Wówczas białoruscy pisarze sowieccy nieustannie wychwalali Stalina, ukazując go jako „wielkiego", „ukochanego", „odważnego", „mądrego", i „genialnego" przywódcę. Przedstawiano go jako ojca narodu, który pieczołowicie dbał o swoich „dzieci". Artykuł pokazuje, że rola Stalina jako domniemanego „wszechpotężnego i wszechwiedzącego władcę" była częściowo pokłosiem polityki kultu jednostki, zaś częściowo jego siłą napędową. W publikacji przeanalizowano obraz Stalina w utworach literackich reprezentujących różne gatunki literackie ze szczególnym uwzględnieniem „listów narodu białoruskiego" do Stalina. Niektóre z nich weszły na stałe do oficjalnego kanonu literatury, a inne zostały szybko zapomniane.

Słowa kluczowe: białoruska sowiecka literatura, kult jednostki Stalina, Związek Pisarzy Białorusi Sowieckiej, kongres pisarzy, poezja

Культ асобы Сталіна матэрыялізаваўся ў вялікі слой культурнай спадчыны. Вобраз «бацькі народаў» можна знайсці ў карцінах, скульптурах, фільмах, тэатральных п'есах, музычных і, канешне, літаратурных творах. Ці мае каштоўнасць спадчына, пакінутая сталінскай эпохай? Разглядаючы яе ў якасці маргінальнага сюжэта

гісторыі сусветнай культуры, паспрабуем даць сцвярджальны адказ на гэта пытанне. Пакідаючы па-за межамі даследавання літаратуразнаўчы аналіз прысвечаных Сталіну твораў, паспрабуем паглядзець на іх як на аскепкі вобразу свету, які існаваў не толькі ў прапагандысцкім вымярэнні.

Літаратурная сталініяна нарадзілася ў рамках сацыялістычнага рэалізма – стылю, які манапольна панаваў у савецкай літаратуры больш за два дзесяцігоддзі. Сацыялістычны рэалізм зрабіўся афіцыйным тэрмінам ў 1934 г., пасля таго як М. Горкі ужыў гэтае словазлучэнне на Першым з’ездзе савецкіх пісьменнікаў. Потым яно трапіла ў статут Саюза пісьменнікаў, адкуль распаўсюдзілася на іншыя сферы культуры і зрабілася абавязковым «метадам». Галоўным замоўцам сацрэалістычных твораў была партыя, якая разглядала культуру як сродак агітацыі і прапаганды. Адпаведна, канон сацрэалізму патрабаваў ад кожнага савецкага пісьменніка паказваць тое, што партыя жадала бачыць. Гэта тычылася не толькі зместу твораў літаратуры, але таксама іх формы. Партыйныя ідэолагі ўкаранялі сацрэалізм у масы як «метад» стварэння культуры новага тыпу, якая, у сваю чаргу, разумелася як найвышэйшае дасягненне чалавечай цывілізацыі. На пытанні аб тым, дзе сканчаецца крытычны рэалізм і пачынаецца сацыялістычны, чым савецкая рамантыка адрозніваецца ад дарэвалюцыйнай ці замежнай выразных адказаў не было.

Пачынаючы з 1930-х гг. «сталініяна» набыла дэ-факта статус важнага феномена савецкай літаратуры. Да гэтага часу быў створаны рытуальны вобраз правадыра, які паступова атаясамліваўся з рэвалюцыяй, партыяй і краінай. Палітычная міфатворчасць, як адзін з цэнтральных элементаў культуры сталінскай эпохі, базавалася на традыцыях, закладзеных у 1920-я гг. Афіцыйны вобраз Сталіна ствараўся паводле ўзору кананізаванага да таго часу вобразу Леніна, што было часткай плана прысабечвання ленінскай спадчыны з мэтай легітымізацыі і ўмацавання адзінаасобнай улады.

## З’яўленне галоўнага літаратурнага героя

Важную ролю у стварэнні культа Сталіна, у яго ўкараненні ў народную свядомасць адыграла беларуская савецкая літаратура. Яна ж зрабілася адной з галоўных ахвяр чалавека, у афіцыйны тытул якога, акрамя іншых эпітэтаў кшталту «карыфея ўсіх навук», уваходзіў эпітэт «лепшы сябра савецкіх пісьменнікаў». Многія беларускія літаратары сталі ахвярамі Сталіна, а тыя, хто пазбег фізічных пакутаў пераўтварыліся ў яго інтэлектуальных рабоў.

Расійскі мастацтвазнаўца Я. С. Громаў у сваёй манаграфіі, прысвечанай таму як Сталін кіраваў савецкім мастацтвам, прыгадаў цікавы факт. Запаўняючы ў 1920 г. анкету Усеўкраінскай партыйнай канферэнцыі, 40-гадовы член бюро ЦК РКП(б) напісаў ў графе прафесія – «пісьменнік (публіцыст)»[1]. Звычайна ў анкетах Сталін пазначаў сваю прафесію як «прафесійны рэвалюцыянер», але самаідэнтыфікацыя ў прыгаданым выпадку ў якасці пісьменніка-публіцыста невыпадковая. Маючы вопыт рэдагавання газеты «Правда», Іосіф Джугашвілі, паводле прыклада Леніна і Троцкага, ужо ў 1920-я гг. праяўляў асабістую цікавасць да літаратурнага працэсу, умешваўся ў яго, надаваў яму ідэалагічнае і палітычнае вымярэнне. Агітацыйна-прапагандысцкія структуры партыйнага апарата заўсёды знаходзіліся ў яго полі зроку. Праз сакратарыят Сталіна праходзілі ўсё важныя рашэнні і пастановы, што фармавалі культурную палітыку ў краіне. Для яго рыхтаваліся рэгулярныя справаздачы аб рабоце газет, часопісаў, выдавецтваў, творчых арганізацый.

Пасля 1934 г., калі партыя ўсур’ёз і дэталёва занялася кіраўніцтвам і кантролем творчасці савецкіх літаратараў, генеральны сакратар тым больш не мог заставацца ў баку ад гэтага працэсу. Літаратура ў савецкай культуры сталінскай эпохі, якую часта называюць літаратурацэнтрычнай, займала надзвычай высокае месца

[1] Громов Е., *Сталин: искусство и власть*, Москва 2003, с. 72.

і Сталін яе курыраваў асабіста. Гэтым тлумачыцца тое, што менавіта літаратура была той сферай, дзе адпрацоўваліся ідэалагічныя і арганізацыйныя навацыі, перад тым як іх пераносілі на іншыя сферы культуры.

У Сталіна была вялікая асабістая бібліятэка, значную частку якой утварала белетрыстыка. Ён адукаваў сябе на літаратурнай класіке, на рэалізме і не ўспрымаў новыя  напрамкі развіцця мастацкай культуры. У нацыянальных літаратурах Сталін бачыў толькі тое, што жадаў і быў у стане ўбачыць. Да пэўнай мяжы ён разумеў памкненні нацыянальных паэтаў і празаікаў, але гэтае разуменне скончалася тады, калі ўздымаліся сапраўдныя праблемы нацыянальнага жыцця.

У 1931 г. у БССР асобным выданнем быў надрукаваны першы беларускі літаратурны твор, які ўсхваляў Сталіна. Яго аўтарам з'яўляўся 25-гадовы сябра толькі створанага Аб'яднання пралетарска-сялянскіх пісьменнікаў І. Барашка. У рэчышчы распрацоўкі пралетарскай эстэтыкі ён напісаў вершаваны нарыс «Асінстан», прысвечаны адкрыццю першай беларускай гідраэлектрастанцыі – БелДРЭС, якой, паводле рашэння кіраўніцтва рэспублікі ў асобе Я. Б. Гамарніка і А. Р. Чарвякова, 1 студзеня 1929 г. было нададзена імя Сталіна. Аўтар прапанаваў чытачам уласную, міфалагізаваную версію надання аднаму з сімвалаў індустрыялізацыі ў Савецкай Беларусі імя яе натхняльніка:

*У залі спакой і ўвага*
*Ёсць прапанова імем Сталіна*
*Назваць наш Асінстан!*
*У воплесках гучэла*
*Урачыстасьць рэволюцыі*
*І аўтарытэт*
*Жалезнага, нязломнага*
*Таварыша СТАЛІНА*[2].

[2] Барашка І., *Асінстан. Нарыс*, Мінск 1931, с. 14.

Услаўленне генеральнага сакратара не змяніла яго агульнага негатыўнага стаўлення да непрадказальных літаратурных экстрымістаў. Пастановай ЦК УсеКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый» ад 23 красавіка 1932 г. Усесаюзнае аб'яднанне Асацыяцый пралетарскіх пісьменнікаў спыніла існаванне. 27 мая 1932 г., пасля таго, як гэтая пастанова была прадубляванa ЦК КП(б)Б, была скасавана БелАПП, на тле якой утварыўся «Саюз Савецкіх пісьменнікаў БССР». Яго першым старшынёй з часу заснавання аргкамітэта саюза ў 1932 годзе і да 1937 г. з'яўляўся М. Клімковіч.

У 1932–1934 гг. ішла праца па фармаванні канцэпцыі сацрэалізма як уніфікаванага светапогляду. Ажыццяўлялася яна шляхам правядзення кампаніі па ідэялагічнай апрацоўцы ўсіх пісьменніцкіх кадраў. Ішла іх селекцыя з мэтай стварэння новай літаратурнай эліты. Сацрэалізм для пішучых павінен быў зрабіцца адзінай філасофіяй творчасці, нормай, па-за межы якой выходзіць было небяпечна. Пазітыўная рэпрэзентацыя сацрэалізма, а таксама яго галоўнага архітэктара суправаджалася вызначэннем непрымальных уладай літаратурных стыляў і форм.

Так, зроблены 28 лютага 1933 г. на першым пленуме аргкамітэта Саюза пісьменнікаў БССР даклад сакратара ЦК КП(б)Б В. Ю. Жаброўскага[3] пад назвай «Задачы мастацкай літаратуры БССР» складаўся пераважна са сталінскіх цытат. Ён пачаў з вызначэння бягучага часу як «гістарычнага перавалу». Так вобразна ён назваў фізічнае знішчэнне і маргіналізацыю ўсіх нязгодных з генеральнай лініяй партыі, спаслаўшыся на словы Сталіна аб тым, што «зьнішчэньне клясаў дасягаецца ня шляхам патуханьня клясавай барацьбы, а шляхам яе ўзмацненьня». В. Ю. Жаброўскі развіў думку пра неабходнасць укаранення ў свядомасць пісьменнікаў «пралетарскага інтэрнацыяналізма» замест «нацыяналізма», які, на думку Сталіна, у кампартыях саюзных рэспублік выконваў тую ж ролю, што ў расійскай кампартыі меншавізм. Скончыў выступ вы-

[3] Расстраляны ў 1937 г.

сокапастаўлены партыйны чыноўнік заклікам ствараць новую беларускую літаратуру «нацыянальную па форме і соцыялістычную па зьмесце»[4]. У сваіх прамовах на пленуме Я. Купала і Я. Колас падтрымалі ідэю стварэння монастылю, але Сталіна не прыгадалі ні разу.

Затое дэлегат XV з'езда КП(б)Б А. Александровіч[5], нібыта замальваючы былыя белапаўскія грахі, у студзені 1934 г. напісаў верш «Песня пролетарскага яднання», дзе кожная страфа сканчалася пяшчотным зваротам да правадыра «Наш родны, любімы наш Сталін!»[6]. У прымеркаваным таксама да партыйнага з'езда артыкуле «Партыя канкрэтна кіруе» літаратурны крытык, адказны сакратар ССП БССР Я. Бранштэйн[7] наступным чынам рыхтаваў аўдыторыю да запланаванага на лета з'езда савецкіх пісьменнікаў: «т. Сталін ужо даўно моцна ўвайшоў у свядомасць найшырэйшых мас нашых пісьменнікаў, як геніяльны настаўнік і лепшы прыяцель совецкай мастацкай літаратуры»[8].

Паводле задумы «лепшага сябры савецкіх пісьменнікаў», паўсядзённы палітычны кантроль над савецкай літаратурай павінны былі ажыццяўляць не толькі адпаведныя партыйныя структуры і цэнзурныя ворганы, але, перш за ўсё, самі пісьменнікі, аб'яднаныя ў новую прафесійную арганізацыю. З дапамогай гэтай арганізацыі планавалася выкарыстоўваць «інжынераў чалавечых душ» у розных палітычных кампаніях, а найперш – ва ўслаўленні правадыра. 1 чэрвеня 1934 г. адбыўся першы з'езд Саюза Савецкіх пісьменнікаў БССР. На ім з дырэктыўным дакладам «Беларуская совецкая літаратура на ўздыме» выступіў загадчык аддзела культуры і прапа-

[4] *Задачы мастацкай літаратуры БССР*, „Чырвоная зьмена" 1933, nr 70, с. 2.

[5] А. І. Александровіч у ліпені 1938 г. быў арыштаваны і прыгавораны як «член антысавецкай нацыяналістычнай арганізацыі» да 15 гадоў зняволення ў папраўча-працоўных лагерах.

[6] Александровіч А., *Песня пролетарскага яднання,* „ЛіМ" 1934, nr 3, с. 1.

[7] Я. А. Бранштэйн у кастрычніку 1937 г. быў асуджаны як «член тэрарыстычнай трацкісцкай арганізацыі» да вышэйшай меры пакарання.

[8] Бранштэйн Я., *Партыя канкрэтна кіруе* „ЛіМ" 1934, nr 3, с. 1.

ганды ленінізма ЦК КП(б)Б Д. Ю. Конік[9]. Ён даў прамое ўказанне беларускім пісьменнікам увасабляць у мастацкіх творах прамовы Сталіна, а таксама яго артыкулы. Не абмежаваўшыся агульным указаннем, ідэолаг на канкртным прыкладзе даклада генеральнага сакратара на студзеньскім (1934) пленуме ЦК УсеКП(б) «Пра работу ў вёсцы» паказаў як яго можна па-мастацку інтэрпрэтаваць[10].

Напрыканцы жніўня 1934 г. у Маскве адбыўся Усесаюзны з’езд пісьменнікаў. Настрой яго удзельнікам задаў старшыня праўлення ССП СССР, заснавальнік метада сацрэалізма М. Горкі. Ён папярэдзіў калег, што гуманізм азначае не толькі каханне да свайго народа, партыі, дзяржавы і Сталіна, але таксама нянавісць да іх ворагаў. У сваёй прамове на з’ездзе старшыня ССП БССР М. Клімковіч намаляваў горкае мінулае, няпростую, азмрочаную нацыяналістамі, сучаснасць і бліскучую будучыню беларускай літаратуры. Усе перамогі беларускіх пісьменнікаў старшыня саюза прама звязаў з «празорлівейшым кіраўніцтвам вялікага Сталіна», падмацаваўшы гэтую думку страфой з верша А. Александровіча «Песня пралетарскага яднання»[11].

Пасля заканчэння Усесаюзнага з’езда пісьменнікаў, сябры беларускай дэлегацыі, якая складалася са старанна адабраных у ЦК КП(б)Б кандыдатур (А. Александровіч, Я. Бранштэйн, П. Броўка, Зм. Бядуля, П. Галавач, Ц. Гартны, І. Гурскі, Х. Дунец, М. Клімковіч, Я. Колас, А. Крапачоў, К. Крапіва, М. Кульбак, Я. Купала, М. Лынькоў, І. Харык, М. Чарот, К. Чорны) напісалі не запланаваны і не ўзгоднены ні з кім ліст Сталіну[12]. Нягледзячы на яго лаяльны змест – беларускія майстры слова абяцалі свайму «лепшаму

---

[9] Д. Ю. Конік у лістападзе 1937 г. быў асуджаны як «член антысавецкай трацкісцкай арганізацыі» да вышэйшай меры пакарання.

[10] „ЛіМ” 1934, nr 38, с. 2.

[11] Клімковіч М., *Совецкая літаратура Беларусі,* „Чырвоная змена” 1934, nr 188, с. 2–3.

[12] Александровіч А., *Пісьменнікі Беларускай ССР, дэлегаты першага ўсесаюзнага з’езда – таварышу Сталіну,* „ЛіМ” 1934, nr 46, с. 1.

сябру» аддаць усе сілы, а калі спатрэбіцца, і жыццё будаўніцтву сацыялізма – ва ўмовах бюракратызацыі літаратурнай творчасці гэты зварот стаў прадметам абмеркавання на сустрэчы беларускіх дэлегатаў з М. Ф. Гікалам.

15 верасня партыйны кіраўнік рэспублікі выступіў перад пісьменнікамі з дакладам пад назвай «За літаратуру, вартую эпохі Сталіна», у якім, пераймаючы правадыру, у сяброўскай манеры павучаў іх як трэба пісаць сапраўдныя літаратурныя творы. У 1934 паслягалодным годзе ён, у прыватнасці, казаў: «Бадзёрасць – вось што істотна. У вас недахоп вялікі – смеха мала. Вось я прачытаў шэраг рэчаў і я б сказаў няма жывасці. Няўжо наша беларуская калгасная вёска альбо наш новы сацыялістычны горад сёння не ахоплены смехам? Вы паглядзіце, калі выходзяць фізкультурнікі, рабочыя ідуць на працу, калгаснікі працуюць у полі, колькі там смеху, жыцця і радасці. Вось такога роду рэчаў у вас няма. Смеласці трэба пабольш»[13].

Закрануўшы ініцыятыву пісьменнікаў адносна ліста правадыру, М. Ф. Гікала адзначыў: «Я асабіста вашага зварота да т. Сталіна не чакаў. Я чакаў, што ў “Правде” будзе сустрэча, але наконт звароту – гэта выйшла ў вас дзівосна»[14]. У выніку ініцыятары зварота да Сталіна атрымалі падарункі (М. Лынькоў – ровар, П. Галавач і М. Клімковіч – па патэфону). Астатнія сябры беларускай пісьменніцкай дэлегацыі таксама не былі забыты. У іх з’явіўся ўласны Дом творчасці і адпачынку ў Пухавічах, дзе меліся ўсе ўмовы для стварэння вобраза новага савецкага чалавека.

Большасць літаратараў не разумела ў якую пастку ў выглядзе Саюза пісьменнікаў іх зацягваў «лепшы сябра». Запалоханыя папярэднімі палітычнымі рэпрэсіямі, а таксама кампаніямі па перавыхаванню, многія беларускія паэты і пісьменнікі бачылі

[13] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф 4п. Воп. 1. Спр. 7614. Арк. 11.

[14] НАРБ. Ф 4п. Воп. 1. Спр. 7614. Арк. 9.

ў Сталіне адзіную надзею на творчае паразуменне і вырашэнне матэрыяльных праблем. Яны цягнуліся да Сталіна як матылькі да святла. Некаторыя прадстаўнікі беларускага літаратурнага цэху кіраваліся ўласнымі сацыялістычнымі перакананнямі. Іншыя паверылі ў магымасць плённага развіцця «нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па змесце» беларускай культуры. Нарэшце многія паэты і пісьменнікі сталі ахвярамі масавага псіхоза абагаўлення «дойліда сацыялізма».

Першыя творчыя здабыткі аб'яднаных у саюз «інжынераў чалавечых душ» заклалі фундамент беларускай літаратурнай сталініяны. Паэт-сатырык К. Крапіва без ценю іроніі вершам «Кім мы сталі сёння» распачаў паэтычную распрацоўку міфалагемы «Сталін – гэта Ленін сёння». У ім былі такія радкі: «Мудрасць Леніна вяла нас / Да здабычы волі / Мужнасць Сталіна натхняла / Нас на смертным полі. // І сягоння…Гляньце, людзі! / Кім мы сёння сталі! / Ордэн Леніна на грудзі  / Прыкалоў нам Сталін»[15]. «Беларускі Ясенін» Т. Кляшторны[16], не ведаючы, што наступны новы год будзе сустракаць у скляпеннях НКУС,  паспрабаваў адлюстраваць міфалагему «БССР – заходні фарпост абароны Радзімы» і напісаў верш «Навагоднія настроі», кульмінацыяй якога былі наступныя радкі: «Мы пільна, мы Сталіна зорка глядзім, / Сто семдзесят свеціць мільёнаў у ім. / Адзін толькі вецер ля нашых граніц / Без візы, без пашпарту можа хадзіць»[17]. Падчас святкавання 30-годдзя літаратурнай дзейнасці Я. Купалы, якое набыла характар дзяржаўна-партыйнага мерапрыемства, паэту зрабілі прапанову ад якой было нельга адмовіцца. Такім чынам напрыканцы 1935 г. з'явіўся квазірэлігійны верш, дзе Сталін параўноўваўся з сонцам:

[15] „Звязда” 1935, nr 155, c. 2.

[16] Т. Т. Кляшторны арыштаваны ў лістападзе 1936 г., расстаняны як «член антысавецкай арганізацыі» у кастрычніку 1937 г.

[17] „Работніца і калгасьніца Беларусі” 1936, nr 1, c. 1.

*Маё мне сонца правадыр,*
*Мне сцежкі знача безупынна,*
*За ім ляцеў-бы на Памір*
*І на Эльбрус, і на Хібіны.*
*За ім, не знаючы нуды,*
*Каналам плыў-бы Беламорскім,*
*Ляцеў-бы вызнаць гарады –*
*Магнітагорскі й Краматорскі*[18].

Вялікае мабілізацыйнае значэнне для беларускіх літаратараў меў III пленум праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, прайшоўшы ў лютым 1936 г. у Мінску. На ім выступалі М. Ф. Гікала, М. М. Галадзед, прадстаўнікі кіраўніцтва саюза, якія прама заклікалі «пець хвалу любімаму, мудраму, найвялікшаму з людзей таварышу Сталіну»[19]. Іх прамовы сустракалі стоячы, апладысментамі і воклічамі «Няхай жыве наш Сталін!».

У жніўні 1936 г. прадстаўнікоў беларускага літаратурнага цэха чакала яшчэ адно выпрабаванне – яны павінны былі далучыцца да прапагандысцкай кампаніі, якая суправаджала першы маскоўскі працэс. На агульным пісьменніцкім сходзе яго ўдзельнікі ўхвалілі ліст Сталіну, дзе, паабяцаўшы аддаць правадыру, у выпадку неабходнасці, усю сваю кроў, патрабавалі смерці «бандыцкім вырадкам[20], якія замахнуліся на самае дарагое, што ёсць у рэвалюцыі – на яе мозг, сэрца, – на Сталіна!»[21]. Скаваныя страхам А. Александровіч, П. Броўка, М. Хведаровіч і А. Дудар, акрамя агульнага ліста, засведчылі ўласную нянавісць да «трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыі» у асобных вершах. Апошні зрабіў гэта за два месяцы да ўласнага арышту: «Шлях вольны ў сонечную шыр, / Над чорнай

[18] „ЛіМ” 1935, nr 70, с. 1.

[19] *Прамова таварыша Н.Ф. Гікало*, „ЛіМ” 1936, nr 18, с. 2.

[20] Сярод 16 расстраляных па выніках працэсу былі першыя бальшавіцкія камісары, якія ўсталёўвалі савецкую ўладу ў Беларусі – І. І. Рэйнгольд і Р. В. Пікель.

[21] „Полымя рэвалюцыі” 1936, Кн. 8, с. 1.

зграяй крыж пастаўлен! / Вядзі-ж далей нас, правадыр, / Вядзі, наш мудры, родны Сталін!»[22]. Пасля першага маскоўскага працэса 1936 г. былі арганізаваны другі (1937) і трэці (1938) маскоўскія працэсы, якія таксама суправаджаліся вершаванымі прысудамі.

Адваротным бокам нянавісці да ворагаў з'яўлялася каханне да правадыроў. Пад уздзеяннем гэтага пачуцця нараджаліся стылізаваныя пад рускі народны гераічны эпас калектыўныя творы з быліннымі назвамі, накшталт «Дванаццаць песень пра нашу непераможную Чырвоную Армію і яе тварца і натхняльніка вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Клімента Варашылава…»[23]. Гэты твор быў напісаны адмыслова да прыезду К. Я. Варашылава на манеўры БВА, якія пачаліся 8 верасня 1936 г. і ва ўрачыстых абставінах уручаны наркаму абароны. «Дванаццаць песень…» выдалі гіганцкім накладам, пераклалі на некалькі моў, іх вучылі на памяць школьнікі.

У 1937 г. твораў А. Александровіча, Э. Агняцвет, П. Броўкі, П. Глебкі, Я. Купалы, Я. Коласа, А. Куляшова, М. Хведаровіча і іншых беларускіх паэтаў, прысвечаных правадыру назбіралася на асобную кніжку[24]. Разам з тым, на думку кіраўніцтва пісьменніцкага саюза, у беларускай літаратуры адчуваўся недахоп асэнсавання вобраза правадыра ў празаічных творах. Гэтую лакуну паспрабаваў запоўніць Э. Самуйлёнак у рамане «Будучыня», дзе паказвалася барацьба за ўсталяванне савецкай улады ў Грузіі ў 1920–1921 гг. У вусны аднаго з сваіх герояў – старога рабочага-каваля Тэафіла Гібі-

[22] Дудар Ал., *Ворагі,* „Полымя рэвалюцыі" 1936, Кн. 8, с. 11.

[23] *Дванаццаць песень пра нашу непераможную Чырвоную Армію і яе тварца і натхняльніка вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Клімента Варашылава, пра гераічныя паходы і бітвы, пра мужнасць сыноў Беларускай зямлі, пра надзейную варту совецкіх граніц, пра еднасць народу і арміі, пра нашых шчаслівых і смелых дзяцей, пра нашу сталінскую радасную моладзь, – напісалі Янка Купала, Якуб Колас, Андрэй Александровіч, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, – прысвячаюцца слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і яе правадыру – першаму маршалу Краіны Соцыялізма Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву,* „Звязда" 1936, nr 209, с. 1–2.

[24] *Сталін у беларускай савецкай паэзіі: Зборнік*, Рэд. М. Лынькоў, Мінск 1937.

сонія – пісьменнік уклаў такія словы: «Шчасце ў барацьбе! Перамагае смеласць! Сказаў той, каго мы звалі Пастырам і Настаўнікам, – Сосо Джугашвілі. Той, хто вучыў нас, рабочых Батумі барацьбе за свае рабочыя права, за вызаленне ад спрадвечнай няволі»[25]. Можна меркаваць, што тэму рамана Э. Самуйлёнку падказаў Л. П. Берыя, які летам 1935 г. прымаў групу беларускіх пісьменнікаў у ЦК КП(б) Грузіі[26].

Патрабаванне ўлады прадставіць Сталіна ва ўсіх літаратурных жанрах спалучалася з запалохваннем, арыштамі, катаваннямі тых, хто не разумеў галоўнай задачы сацыялістычнага рэалізма. У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г. у сутарэннях мінскай унутранай турмы НКУС было расстраліна вялікая група выбітных прадстаўнікоў беларускай літаратуры. Псіхалагічны стан тых, хто заставаўся на волі, але мог у любы момант згубіць усё, аж да жыцця, перадаюць радкі, напісаныя ў дні вялікага тэрору А. Куляшовым: «Ён – бацька мой. / Мне паміраць не страшна. / Да кроплі ўсё жыццё яму аддам»[27].

Пасля арышту ў 1938 г. аднаго з найбольш натхнёных апявальнікаў Сталіна А. Александровіча[28], яго месца занялі прадстаўнікі новай паэтычнай генерацыі – А. Астрэйка, М. Аўрамчык, М. Калачынскі, якія творча сфармаваліся ва ўмовах рэпрэсій. У некаторых іх творах ліслівая паслужлівасць дасягнула рысы абсурда. Напрыклад, М. Калачынскі так развіў міф аб Сталіне-сонцы, запачаткаваны Я. Купалам у 1935 г.: «Як сонца дорыць, шле спрадвеку / Цяплынь зямлі – лясам, палям, / Так дорыш ласку чалавеку / Ты, Сталін сонечны, з Крамля»[29].

---

[25] Ларчанка М. Г., *Аб рамане «Будучыня» Э. Самуйлёнка,* „Звязда” 1938, nr 201, с. 3.

[26] *Прыём у тав. Берыя,* „Звязда” 1935, nr 155, с. 2.

[27] Панчанка П., *Гордасць нашай паэзіі*, „ЛіМ” 1946, nr 5, с. 5.

[28] Падчас вялікага тэрору ў зале сходаў Саюза пісьменнікаў БССР вісеў вялікі партрэт «вядучага пралетарскага паэта» А. Александровіча, а над ім – словы А. М. Горкага «Калі вораг не здаецца, яго знішчаюць». Калубовіч А., *Крокі гісторыі,* Беласток-Вільня-Менск 1951, с. 132.

[29] Калачынскі М., *Народны Сталін,* „ЛіМ” 1939, nr 19, с. 3.

Пасля 17 верасня 1939 г. прапагандай пачаў фармавацца новы вобраз Сталіна як вызваліцеля Заходняй Беларусі і аб'яднальніка беларускага народа. Для значнай часткі насельніцтва Заходняй Беларусі, у т. л. творчай інтэлігенцыі, савецкі дыктатар з'яўляўся жывым увасабленнем вызвалення ад польскага нацыянальнага прыгнёту. 28 кастрычніка 1939 г. дэпутат Народнага сходу Заходняй Беларусі паэт Міхась Машара, за плячыма якога былі польскія лягеры для ваеннапалонных і турма Лукішкі, пачаў выступ са звароту да правадыра:

*СТАЛІН!*
*З цябе пачынаецца прамова,*
*Ты – першае вольнае слова маё.*
*Сёння мы жыць пачынаем нанова, –*
*Сонцам крынічыцца наша жыццё*[30].

Актыўны сябра КПЗБ М. Танк увосень 1939 г. таксама наўпрост звязваў словы «Сталін» і «Воля»:

*А толькі скажаш: Воля… Сталін!..*
*З старон пачуеш чатырох,*
*Як адгукнуцца рэхам далі*
*На розных мовах і ладох*[31].

У снежні 1939 г. уласнымі вершамі «бацьку народаў» з 60-годдзем віншавалі Я. Купала, Я. Колас, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, Э. Агняцвет і інш. Колькасць напісаных беларускімі аўтарамі вершаў у гонар юбіляра дазволіла ўпершыню зрабіць іх прадметам літаратуразнаўчага аналізу. Яго аўтар – дырэктар Інстытута літаратуры і мовы АН БССР В. В. Барысенка, у прыватнасці, пісаў: «У свабодалюбівых песнях аб Сталіне гучыць гарачая любоў да свайго правадыра… Ідэя бязмежнай адданасці яму пранізвае ўсю нашу літаратуру»[32].

---

[30] Машара М., *Таварышу Сталіну*, „Звязда" 1939, nr 254, с. 1.

[31] Танк М., *Сягоння*, „Звязда" 1939, nr 257, с. 3.

[32] Барысенка В., *Вобраз вялікага правадыра ў беларускай літаратуры,* „Полымя рэвалюцыі" 1939, nr 11–12, с. 64.

## «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну»

Стварэнню летам 1936 г. аднаго з найбольш знакамітых артэфактаў беларускай таталітранай культуры – «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» папярэднічаў пераклад у лютым 1936 г. А. Александровічам, П. Броўкам, П. Глебкам і К. Крапівой на беларускую мову «Пісьма працоўных Совецкай Грузіі правадыру народаў вялікаму Сталіну». Гэты выраб нарадзіўся ў нетрах прапагандысцкіх структур партыйнага кіраўніцтва Савецкай Грузіі. Яго падпісала больш мільёна чалавек. Паводле задання тагачаснага сакратара ЦК КП(б)Грузіі Л. П. Берыя, грузінскія паэты надалі яму вершаваную форму[33]. Сталін годна ацаніў падарунак – студэнт Тыфлісскай духоўнай семінарыі Іосіф Джугашвілі сам пісаў нядрэнныя вершы.

Вершаваны ліст грузінскіх паэтаў стаў штуршком для стварэння падобных твораў у іншых рэспубліках Савецкага Саюза. Згодна правілаў ідэялагічнай гульні, «ініцыяваць» іх былі павінны працоўныя. У Савецкай Беларусі з падобнай «ініцыятывай» у маі 1936 г. выступілі калгаснікі Бабруйскага раёна, якія прапанавалі скласці паэтычны зварот да правадыра, прычым пазначылі канкрэтную дату, да якой ён павінен быць скончаны – 11 ліпеня[34]. Насамрэч прапанаваў і курыраваў гэты праект ад пачатку да канца М. Ф. Гікала.

Успаміны мастака Я. Ціхановіча дазваляюць у агульных рысах рэканструяваць працэс вырабу гэтага калектыўнага твора. У канцы мая 1936 г. была створана аўтарская група, куды ўвайшлі Я. Купала, Я. Колас, А. Александровіч, П. Броўка, П. Глебка і І. Харык. Старшынёй групы, як найбольш палітычна падрыхтаванага, прызначылі А. Александровіча. Кожны з паэтаў распрацоўваў уласную тэму.

[33] *Пісьмо працоўных Совецкай Грузіі правадыру народаў вялікаму Сталіну,* „ЛіМ” 1936, nr 17, с. 1–2.

[34] *Поддержим инициативу колхозников Бобруйщины,* „Рабочий” 1936, nr 113, с. 1.

Напрыклад, Я. Купала апісваў цяжкое дарэвалюцыйнае жыццё беларусаў, вершаваў «песні жальбы», якія дазвалялі не хлусіць, альбо амаль не хлусіць.

Усё напісанае падлягала жорсткай цэнзуры, у выніку якой радкі касаваліся дзясяткамі. Перыядычна сябраў групы прывозілі на лецішча ЦК, дзе партыйныя кіраўнікі слухалі напісаныя кавалкі, давалі па іх заўвагі і парады. Апошнюю, «экзаменацыйную» чытку напісанага паэтамі, Я. Ціхановіч, які прысутнічаў на ёй у сярэдзіне чэрвеня ў якасці сябры групы па мастацкім афармленні ліста, помніў усё жыццё:

> З'ехалася шмат людзей. Усе пагадзіліся з тым, што пісьмо адпавядае сваёй ідэі і ўздымае беларускі народ "на добрую працу, як абавязацельства перад вялікім і мудрым таварышам Сталіным". Як самое пісьмо не мела аднаго аўтара і афарміцеля, дык лічылася, што ўсё гэта рабіў сам народ. Мабыць, таму загадчык аддзела агітацыі і прапаганды ЦК Ткачэвіч[35] тры гадзіны даўбіў мне ў галаву, што аўтарам куфра з'яўляецца беларускі народ, а не мастак Яўген Ціхановіч[36].

Адразу пасля ўхвалы партыйным кіраўніцтвам вершаванага тэкста, якому было вырашана даць назву «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну», пачалося яго абмеркванне і падпісанне ў працоўных калектывах рэспублікі. Галоўнай мэтай гэтай ініцыяванай зверху кампаніі было ўмацаванне народнай веры ў правадыра. Але была і больш прагматычная мэта, а менавіта, з выкарыстаннем мабілізацыйных магчымасцяў паэзіі размясціць дзяржаўную ўнутраную пазыку чацьвёртага году другой пяцігодкі. Такім чынам, людзі, ставячы подпіс пад «Пісьмом…» адначасова адмаўляліся ад адна-, дзвюх-, ці трохдзённага заробку ў абмен на аблігацыі пазыкі. Для рэалізацыі гэтай палітыка-эканамічнай кампаніі на месцах былі выдзелены адказныя раённыя работнікі – партыйныя і кам-

[35] Маецца на ўвазе начальнік Упраўлення мастацтваў пры СНК БССР І. М. Ткачэвіч, арыштаваны ў лістападзе 1937 г. і расстраляны як «член контррэвалюцыйнай трацкісцкай тэрарыстычнай арганізацыі».

[36] *Ціхановіч Я., Партрэт стагоддзя,* Minsk 2015, с. 21.

самольскія функцыянеры, начальнікі аддзелаў міліцыі, загадчыкі фінаддзелаў і інш.

Тое, як гэта адбывалася ў сельскай мясцовасці дапамагае ўявіць складзеная загадчыкам сельгасаддзела ЦК КП(б)Б А. С. Картуковым[37] па гарачых слядах падзей дакладная на імя М. Ф. Гікалы. Першая частка гэтага дакумента мае відавочна публіцыстычна-літаратурны характар, у ёй чытаецца жаданне партыйнага чыноўніка дагадзіць аўтару і кіраўніку праекта. А. С. Картукоў сцвярджаў, што сяляне ў цэлым ахвотна падпісваюць ліст, праілюстраваўшы гэта кранальнымі ў сваёй прастаце і шчырасці прыкладамі. Так, у калгасе «Новае жыццё» Уздзенскага раёна калгасніцы-стаханаўкі 72-гадовая Е. Кароль і 56-гадовая М. Кароль на сходзе заявілі, што «у лісце паказаны яшчэ не ўсе дасягненні, на самой справе іх значна больш» і падпісаліся на 50 рублёў. 65-гадовую непісьменную калгасніцу калгаса «Другая пяцігодка» Мсціслаўскага раёна Хайкіну дзеля яе далучэння да вялікай справы спецыяльна вучылі распісвацца. У калгасе «Чырвоны Кастрычнік» таго ж раёна калгаснік Леонаў на сходзе заявіў: «Трэба сапраўды перадаць вялікі дзякуй Сталіну за наша цудоўнае жыццё. Жывем мы багата, як ніколі не жылі, працаваць весела ў калгасе, з намі размаўляюць як з роўнымі і ў таварыша Сталіна хапае часу забоціцца аб усіх рабочых, калгасніках, жанчынах і дзецях»[38].

Другая частка дакладной А. С. Картукова зафіксавала пратэстныя настроі, што існавалі ва ўжо калектывізаванай да таго часу беларускай вёсцы. Так, у калгасах «Чапаеў», «Германскі пралетарыят», «Каменка», а таксама імя Варашылава Круглянскага раёна падпісанне ліста было цалкам сарвана. У калгасе «Гарадзец» Сенненскага раёна 40% прысутных на сходзе калгаснікаў адмовіліся ад падпісання ліста. У калгасе «Пуцілавец» Пухавіцкага раёна ад удзелу ў прапагандысцкім мерапрыемстве адмовілася ў поўным

[37] У кастрычніку 1937 г. выключаны з партыі «за сувязь з ворагамі народа», расстраляны ў ліпені 1941 г. на спецаб'екце НКУС «Камунарка» у Маскоўскай вобласці.

[38] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10827. Арк. 255–257.

складзе адна паляводчаская брыгада. У калгасе «Другая пяцігодка» Віцебскага раёна са 120 чалавек, што прысутнічалі на сходзе ліст падпісалі толькі 49. Астатнія пагадзіліся далучыцца да «вялікай народнай справы» толькі пасля з'яўлення на сходзе сакратара райкама партыі В. В. Башмачнікава.

У калгасе імя Кірава Пухавіцкага раёна «кулак» С. Карнейчык заявіў на сходзе, што «у Германіі правадыры бываюць часцей сярод народу, чым у нас». Падчас абмеркавання ліста ў калгасе «Свабода» Старобінскага раёна калгасніца М. Сіваблоцкая заявіла: «Жонкі, хадземце да хаты, нам няма што падпісваць, бо мы ў гэтым не разбярэмся. Хай мужыкі мяркуюць трэба падпісваць ці не. Тут напісана шмат таго, чаго ў сапраўднасці няма». У калгасе імя Варашылава Кіраўскага раёна А. Канавалаў катэгарычна адмовіўся ад подпісу, сказаўшы: «раней на хутарах нам жылося лепей, а зараз у нас усё забірае дзяржава». У саўгасе «Габрыэлева» Пухавіцкага раёна ліст адмовіліся падпісваць усе за выключэннем дырэктара і яго намеснікаў. У калгасе «Зарэчча» Хоцімскага раёна адмовіўся падпісваць ліст старшыня калгаса Пецеркін, за што яго адразу ж знялі з працы. У калгасе «Х з'езд саветаў» Смілавіцкага раёна калгаснік Н. Мазоўка казаў: «Бачыце, бальшавікі не дурні. Ім патрэбна цара абраць. Вось зараз збіраюць подпісы, а потым скажуць – вы яго, Сталіна, абралі». Падобную думку выказала калгасніца калгаса «Парыжская камуна» Чырвеньскага раёна М. Бялевіч: «Лепш падпісаць ліст цару, чым Сталіну». У калгасе «Сцяг кастрычніка» таго ж раёна калгаснік Ю. Няхай заявіў на сходзе «Нам не трэба падпісваць ліст таварышу Сталіну, бо ён у нас забірае хлеб, мяса і малако»[39].

Цытуемы дакумент не ўтрымлівае якое-небудзь лічбавай інфармацыі, таму спраўдзіць афіцыйна агучаную ў СМІ лічбу – 3 млн жыхароў БССР, падпісаўшых у чэрвені–ліпені 1936 г. «Пісьмо…», не ўяўляецца магчымым. Аднак, згаданыя ў ім шматлікія факты ад-

[39] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10827. Арк. 258–261.

мовы ўдзельнічаць у найважнейшым у рэспубліцы прапагандысцкім мерапрыемствы, дазваляюць казаць пра бездань, якая да 1936 г. утварылася паміж уладай і часткай прымусова калектывізаванага сялянства.

У святочны дзень 11 ліпені 1936 г., у адпаведнасці з пастановай бюро ЦК КП(б)Б, «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну» надрукавалі ў газетах і перадалі па радыё[40]. «Пісьмо…», адпаведна густу адрасата, з'яўлялася эпічна-былінннай стылізацыяй, пра што сведчылі ўжо яго першыя радкі:

*З-пад пушчаў Палесся, з-пад Нёмана, Сожа,*
*З пад Пцічы, Дняпра і Заходняй Дзвіны,*
*З-пад стыку са светам чужым і варожым,*
*Прышлі мы, Совецкай краіны сыны.*

«Пісьмо…» утрымлівала ўвесь набор сталінскіх ідэялагем – шчасце фабрычна-заводскай і калгасна-саўгаснай працы, нянавісць да капіталістычнага атачэння, у першую чаргу да «фашысцкай Польшчы», звядзенне ўсёй беларускай гісторыі да класавай барацьбы і, канешне, абагаўленне народам правадыра. Гэтыя ідэялагемы былі ўвасоблены ў прафесійна складзеных 97 чатырохрадковых (калектыўных) і 40 дзвюхрадковых (купалаўскіх) строфах. Падобнай метрычнай пабудовай Я. Купала, напэўна, імкнуўся адасобіцца ад адыёзнага твору, які скончаўся прыніжана-рабскім народным паклонам Сталіну:

*Хай смутак вачэй тваіх добрых не росіць,*
*Ці сонейка захад, ці сонейка ўсход.*
*Прымі прывітанне, якое прыносіць*
*Табе, правадыр, беларускі народ.*

Да часу з'яўлення «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» у друку, М. Ф. Гікала ўжо выканаў сваю частку негласнай

[40] *Пісьмо беларускага народа вялікаму СТАЛІНУ,* „ЛіМ" 1936, nr 43, c. 1–2.

дамовы з яго аўтарамі. Праўленне Саюза пісьменнікаў атрымала 26 тыс. рублёў на будаўніцтва 6-кватэрнага дома. Яшчэ 25 тыс. рублёў былі выдаткаваны на пабудовы лецішча для народнага паэта Я. Купалы[41].

Праект М. Ф. Гікала не абмяжоўваўся стварэннем паэтычнага «шэдэўра», ён прадугледжваў пераўтварэнне «Пісьма…» у артэфакт культуры, які б адпавядаў велічы адрасата. Найперш, было вырашана вышыць вершаваны тэкст залатымі, чырвонымі, блакітнымі, зялёнымі, шэрымі і карычневымі ніткамі на 24 шаўковых аркушах, дзеля чаго ў Мінск з розных куткоў Беларусі былі дастаўлены 37 лепшых вышывальшчыц. Іх адбор уключаў праверку не толькі прафесійных здольнасцяў, але таксама сацыяльнага паходжання, нацыянальнасці і сямейнага становішча. Да восені праца была скончана і шчодра аплачана[42]. Перад ад’ездам дамоў вышывальшчыц асабіста дзякаваў М. Ф. Гікала, атрымаўшы ад жанчын на развітанне вышыванку[43].

Адначасова з вышывальшчыцамі, у Мінску працавала брыгада з васьмі сабраных з усёй рэспублікі лепшых сталяроў-разьбяроў пад кіраўніцтвам народнага майстра з в. Недашоў Магілёўскага раёна Я. С. Арлова[44]. У выніку іх намаганняў быў выраблены ўнікальны

[41] „Звязда” 1936, nr 126, с. 2.

[42] Заўважаны А. Блюмам феномен сталінізма пад назвай «бюракратычная анархія» быў характэрны нават для вышэйшых эшэлонаў улады БССР. Бухгалтэрыя ЦК КП(б)Б у спешцы не ўключыла ў ведамасць на аплату прозвішчы вышывальшчыц С. Пратасевіч і В. Акуловіч са Слуцкага раёна. Іх праца была аплочана толькі пасля скаргі калгасніц М. Ф. Гікалу.

[43] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10694. Арк. 1-44.

[44] Вясковы майстар Я. С. Арлоў звярнуў на сябе ўвагу ўлады ў 1932 г., калі падараваў магілёўскай раённай партканферэнцыі інкруставаны беларускім арнаментам пісьмовы стол з гравіроўкай «Пролетарыі ўсіх краін злучайцеся!». Неўзабаве ён атрымаў ад парткіраўніцтва замову на выраб пяці шахматных столікаў для мінскага Палаца піянераў і акцябрат, кожны з якіх складаўся з 11 тыс. кавалкаў арэха, дубу, ліпы і сасны. Пасля выканання скрыні для «Пісьма…», у 1939 беларускае кіраўніцтва замовіла Я. С. Арлову інкруставаны пісьмовы стол, які меркавалася падараваць Сталіну.

куфар для захавання тканага «Пісьма…». Звонку куфар быў упрыгожаны выявамі ордэна Леніна, прамысловых прадпрыемстваў, калгасных палетkaў, памежнікаў, выкананымі паводле эскізаў В. Волкава, М. Пашкевіча, Я. Ціхановіча, М. Гусева, А. Жорава, В. і А. Мурашовых, а таксама А. Каржанеўскага. Падчас рэалізацыі гэтых эскізаў сталяры скарысталі 110 тыс. кавалкаў дрэва розных парод[45].

Нарэшце 20 лістапада 1936 г. «Пісьмо беларускага народа Вялікаму Сталіну» у выглядзе пераплеценай стужкамі з беларускім арнаментам вялікай шоўкавай кнігі, а таксама скрыня былі выстаўлены ў асобным пакоі па суседству з залай пасяджэння надзвычайнага XII з’езда Советаў БССР. Побач са скрыняй стаяў футурал для яе, выраблены з чырвонага дрэва і абабіты шоўкавымі пухоўкамі. У пакоі знаходзіўся Я. С. Арлоў, які даваў неабходныя тлумачэнні дэлегатам з’езда[46]. Праз тыдзень артэфакт быў ужо дастаўлены ў Маскву, дзе пачаўся надзвычайны VIII Усесаюзны з’езд саветаў, скліканы для разгляду і зацьвярджэння праекта новай Канстытуцыі СССР.

28 лістапада 1936 г. на чацьвёрты дзень працы з’езда, пасля выступлення работніцы-стаханаўкі мінскай фабрыкі «Кастрычнік» Дусі Кісялёвай, прадстаўнікі беларускай дэлегацыі ўнеслі скрыню з «Пісьмом…» у залу і падышлі з ёю да прэзідыўма, дзе сядзеў Сталін. Дуся дастала «Пісьмо…» са скрыні, паказала яго прысутным у зале, пасля чаго паэтычны твор разам са скрыняй перадалі ў прэзідыўм[47]. У Сталіна падарунак беларусаў не выклікаў вялікіх эмоцый. У той час ён атрымліваў падобныя «калектыўныя творы народаў СССР» ледзь не штотыднёва. «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну» перадалі ў Музей рэвалюцыі СССР[48], дзе яно захоўваецца і цяпер.

---

[45] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10693. Арк. 7.

[46] Чыкун П., *Сундук-унікум*, „Звязда” 1936, nr 268, с. 3.

[47] *Прамова тав. Кісялёвай*, „ЛіМ” 1936, nr 68, с. 3.

[48] Сёння Музей сучаснай гісторыі Расіі.

У Савецкай Беларусі «Пісьмо…» прапагандавалася як найвышэйшае дасягненне нацыянальнай літаратуры і мастацтва. Пасля першага выдання ў 1936 г., кожны перадваенны год яго асобна перавыдавалі вялікімі накладамі[49]. На замову беларускага партыйнага кіраўніцтва, група расійскіх паэтаў у складзе А. Безыменскага, М. Галоднага, М. Ісакоўскага і А. Суркова ажыццявілі пераклад твора на рускую мову. Калектыў беларускіх кампазітараў у складзе В. Залатарова, І. Любана, А. Туранкова, М. Аладава, М. Цікоцкага, М. Іванова і С. Палонскага да свята 7 кастрычніка 1936 г. на словы «Пісьма…» напісалі «кантату для выканання сімфанічнымі аркестрамі, хорамі, салістамі і на беларускіх інструментах»[50]. Белдзяржкіно прысвяціла яму асобны дакументальны фільм[51]. З'явіліся грамафанныя запісы песень, напісаных кампазітарам С. Палонскім на асобныя фрагменты гэтага твора[52]. Прыкметай палітпісьменнасці аўтара стала выкарыстанне радкоў «Пісьма…» у якасці цытат і эпіграфаў да артыкулаў. Нарэшце яго ўключылі ў навучальную школьную праграму.

Як і большасць твораў беларускай савецкай літаратуры, «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну» мае ўласную цэнзурную гісторыю. Так, пасля арышту ў верасні 1937 г. І. Харыка, яго прозвішча знікла з пераліку аўтараў, якія у вершах «пераказалі словы беларускага народа»[53]. Падобным чынам з калектыва аўтараў, пасля арышту ў ліпені 1938 г., знік А. Александровіч[54]. Пасля падпісання ў 1939 г. пакта Молатава – Рыбентропа, зрабіліся непатрэбнымі

[49] Напрыклад, у 1940 г. яно выйшла пяцітысячным накладам. Гл.: *Вялікаму Сталіну ад беларускага народа,* Мінск 1940.

[50] *Музыка да тэксту пісьма беларукага народу вялікаму Сталіну,* „Звязда" 1936, nr 208, с. 4.

[51] Караткевіч А., *Падарунак калгасніку Арлову,* „Звязда" 1937, nr 52, с. 4.

[52] *Грамафонны запіс народных песень,* „ЛіМ" 1936, nr 70, с. 3.

[53] *Сталін у беларускай савецкай паэзіі: Зборнік*, Рэд. М. Лынькоў, Мінск 1937, с. 117.

[54] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 12241. Арк. 5.

радкі пра «фашыстаў–бандытаў», якія павінны былі «касцямі палегчы на пагост». Тым не менш, цэнзары пасля ваганняў ўсё ж пакінулі гэтыя радкі, бо ў лісце не ўказвалася нацыянальная прыналежнасць «фашыстаў»[55].

Поспех «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» быў замацаваны ў яшчэ адным калектыўным творы пад назвай «Пісьмо таварышу Сталіну ад вызваленага народа Заходняй Беларусі». Ідэя паўтарэння прапагандысцкай акцыі 1936 г. з’явілася ў беларускага партыйнага кіраўніцтва ў лютым 1940 г. Акрамя выхавальніцкага эфекта, падобная акцыя дазваляла першаму сакратару ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнку яшчэ раз засведчыць уласную адданасць «гаспадару». У склад аўтараў было вырашана ўключыць ужо публічна прадэманстраваўшых здольнасць працаваць у рамках сацрэалістычнага канону М. Машару, М. Танка, а таксама падлягаўшую перавыхаванню Н. Арсенневу. Узначаліць гэты калектыў аўтараў даручылі М. Клімковічу, які толькі вызваліўся ад пасады старшыні праўленя Саюза пісьменнікаў.

«Пісьмо таварышу Сталіну ад вызваленага народа Заходняй Беларусі» было напісана з 11 па 21 сакавіка на базе рэдакцыі вілейскай абласной «Сялянскай газеты», дзе ў той час працавалі ўсе тры заходнебеларускія аўтары. Н. Арсеннева так узгадвала гэты эпізод свайго жыцця падчас размовы з міністрам замежных спраў П. К. Краўчанка у 1991 г. у Нью-Ёрку:

> Аднойчы рэдактар вілейскай абласной “Сялянскай газеты” паклікаў нас: мяне, Танка, якраз тады Машара быў, таксама ўдзельнік, прыехаў проста так. Паклікаў і кажа: збіраемся пісаць ліст да таварыша Сталіна. Вы будзеце пісаць ад беларусаў. Трэба, кажа, тры раздзелы зрабіць. Адзін палітычны, другі нейкі там яшчэ, а трэці пра тое, што добрага далі нам Саветы. І мы пачалі дзяліць, пагадзіліся зусім ахвоча. Нават спрачаліся. Адзін казаў: я буду аб гэтым пісаць, другі – аб гэтым. Мы ўзяліся пісаць пра тое, як савецкая ўлада адносілася

[55] *Вялікаму Сталіну ад беларускага народа,* Мінск 1940, с. 9.

да дзяцей, як шмат было дзяцей-сірот, як былі заснаваныя прытулкі для дзяцей, як сталі іх вучыць. Гэта я на сябе ўзяла. І выканалі… Я толькі паспела 24 радкі напісаць, каб паказаць, ці так усё, як яны хочуць[56].

Удзел у важнай прапагандысцкай акцыі не выратаваў Н. Арсенневу (як падчас вялікага тэрора І. Харыка і А. Александровіча) ад палітычных рэпрэсій. Падчас напісання «Пісьма…», у красавіку 1940 г. яе, як жонку польскага афіцэра, які да таго ж знаходзіўся ў зняволенні, з двума дзецьмі выслалі ў Казахстан. Але ўжо ў маі 1941 г., дзякуючы хадайніцтву Я. Купалы і М. Танка, дазволілі вярнуцца дадому.

Арышт і высылка аднаго з аўтараў «Пісьма…» запаволіла яго публічную рэпрэзентацыю. Нарэшце ў лістападзе 1940 г. «Пісьму…» далі новую назву «З тваім імем у сэрцы». Замест Н. Арсенневай у складзе аўтараў з'явіўся П. Пестрак[57]. Ад пампезнага ўручэння «Пісьма…» яго адрасату, як гэта было ў 1936 г., П. К. Панамарэнка вырашыў адмовіцца. Мы можам толькі меркаваць, ці даведаўся калі-небудзь Сталін пра словы падзякі насельніцтва Заходняй Беларусі:

*Мы збіраліся даўна, бацька родны, любімы,*
*Песьняй, звонам цымбалаў і сярэбраных струн*
*Расказаць пра наш край, як у няволі жылі мы*
*Як з усходу чакалі сваю долю-зару.*
*Расказаць пра сустрэчу з баявымі сцягамі,*
*Азарыўшымі сонцам і зорамі шыр,*
*Пра вялікую радасць спаткання з братамі,*
*Пра ўдзячнасць народу Табе, правадыр!*[58]

[56] Медзяльцоў А., *Наталля Арсеннева праз успаміны Пятра Краўчанкі*, „Рэгіянальная газета" 2016, nr 5, c. 13.

[57] Пестрак Ф., Танк М., Машара М., Клімковіч М., *З тваім імем у сэрцы. Таварышу Сталіну*, „ЛіМ" 1940, nr 39, c. 2.

[58] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 15658. Арк. 1.

Калектыўныя вершаваныя лісты правадыру сёння цікавыя не толькі іх статусам галоўных ідэялагічных літаратурных праектаў сталінскай эпохі. У іх праявілася адна з найбольш яскравых рысаў сацыялістычнага рэалізму, а менавіта, замена індывідуальнай асобы аўтара на калектыўную, абагуленую. Падобная дэіндывідуалізацыя творчасці паэтаў сумяшчалася з жорсткім ідэялагічным кантролем за прадукаваннем імі найважнейшых твораў афіцыйнай літаратуры. Гэты кантроль вызначаў не толькі змест, але і форму калектыўных лістоў беларускіх паэтаў, некаторым з якіх быў нададзены ананімны характар. Падобны пазааўтарскі характар мела, напрыклад, вершаванае «Пісьмо камсамольцаў і моладзі Беларускай ССР таварышу Сталіну ў дзень 25-годдзя камсамола Беларусі»[59].

Вершаваныя лісты Сталіну былі сугестыўныя, яны прымушалі працаваць уяўленне чытачоў, выклікалі ў іх яскравыя эмоцыі, прапаноўвалі новае разуменне свету. Найбольш важным у іх было праяўленне сямейнага пачуцця кахання да калектыўнага бацькі. Сугестыўнасці таксама спрыяла абавязковая віктымная складаючая лістоў, дзе апісваліся пакуты беларускага народа ад падступных «літоўскіх феадалаў», «белапалякаў», «фашыстаў». Эмацыйна насычанымі былі апісанні набыцця Беларуссю дзяржаўнасці, героікі ваеннага і мірнага часоў, а таксама свята савецкага жыцця. Кожны ліст, напісаны нібыта ад імя простага чалавека, сканчаўся зваротам да вярхоўнага дыміўрга, які натхняў кожнае здзяйсненне жыхароў БССР.

Усё гэта было ўласціва лісту Сталіну пад назвай «Ад усяго сэрца», складзенаму Я. Коласам, П. Броўкам, П. Глебкам, К. Крапівой, А. Куляшовым, П. Панчанкам, М. Танкам і прымеркаванаму да 30-годдзя ўтварэння БССР. Ліст утрымліваў усе гістарычныя штампы, сфармуляваныя напярэдадні ў сумнавядомых «Тэзісах да асноўных пытанняў гісторыі БССР» і сканчаўся словамі пры-

---

[59] *Пісьмо камсамольцаў і моладзі Беларусі таварышу Сталіну ў дзень 25-й гадавіны ЛКСМБ,* „ЛіМ" 1945, nr 19, с. 1.

вітання правадыру: «Ты – настаўнік народаў, зямлі красаванне, / Дык жыві нам на радасць, не лічачы год, / Нібы сонца само, нібы яснае ранне, / Дык прымі, дарагі правадыр, прывітанне, / Што складае табе беларускі народ»[60].

Апошні калектыўны паэтычны твор пад назвай «Вялікаму Сталіну ў дзень 70-годдзя ад беларускага народа» з'явіўся ў снежні 1949 г. і меў ананімны характар. Паводле задумы першага сакратара ЦК КП(б)Б М. І. Гусарава, знікненне з апошняй старонцы ліста імёнаў аўтараў было павінна прадэманстраваць сапраўды «народны» характар ліста. Складзены прафесійнымі літаратарамі, якія выконвалі ролю медыўмаў «народнасці», «калектыўнасці», «масавасці», гэты твор у значнай ступені паўтараў змест папярэдніх лістоў, але саступаў ім, прынамсі, у якасці рыфмы: «У дзень твайго сямідзесяцігоддзя / Яшчэ цясней еднаем мы рады, / Да комунізма мы з табою пойдзем, / На подзвігі гатовыя заўжды»[61].

## У літаратуры спыненага часу

Пасля заканчэння катастрафічнага першага этапа вайны, апрануўшыя шынялі паэты працягнулі стварэнне беларускай сталініяны. Напрыклад, працуючы ў рэдакцыях шэрагу франтавых газет, П. Глебка узбагаціў яе  вершамі «Правадыр», «Да моладзі», «Райком»[62]. Эвалюцыю культавай паэтыкі ў ваенныя гады прадэманстраваў конкурс на стварэнне гімна БССР, які праводзіўся ў Мінску ў другой палове 1944 – пачатку 1945 гг. З транаццаці варыянтаў гімна, прадстаўленых беларускімі прафесійнымі літаратарамі, не было ні воднага, дзе б не згадваўся Сталін. Не быў у гэтым сэнсе выключэннем пераможца конкурсу, аўтарамі якога з'яўляліся

[60] *Ад шчырага сэрца: зборнік вершаў беларускіх паэтаў, прысвечаных І. В. Сталіну*, Рэд. П. Броўка, Менск 1952, с. 16–27.

[61] *Вялікаму Сталіну ў дзень 70-годдзя ад беларускага народа,* „Звязда" 1950, nr 1, с. 1–2.

[62] Кірыенка К., *Велічныя вобразы,* „ЛіМ" 1952, nr 25, с. 1.

сябры журы (!) кампазітар А. Багатыроў, а таксама паэты К. Крапіва і П. Броўка. У іх творы сцвярджалася, што «Вялікі Кастрычнік нас вывеў з нядолі, / Расія-сястра ў барацьбе памагла. / Нас Ленін вучыў як змагацца за волю, / Са Сталіным наша краіна ўзрасла»[63].

Вайна запатрабавала ад «інжынераў чалавечых душ» паэтызацыі новых вобразаў правадыра – палкаводца, вызваліцеля, будаўніка. М. Аўрамчык назваў савецкія войскі, увайшоўшыя ў Мінск 3 ліпеня 1944 г. «салдатамі Сталіна», Р. Няхай – «гвардзейцамі Сталіна». М. Калачынскі наступным чынам міфалагізаваў 25-хвілінны прыпынак кіраўніка дзяржавы на мінскім вакзале, які адбыўся 15 ліпеня 1945 г. на шляху ў Патсдам:

*У час той вясновы – казалі ў народзе –*
*Па вуліцах нашых ён, родны, праходзіў*
*Ішоў правадыр па сталіцы як дойлід*
*На ўсім – гаварылі – спыняў ён свой погляд.*
*Ён сам вызначаў, дзе паставіць заводы,*
*Дзе мінскага мора запеняцца воды.*
*І там, дзе адзнакі ў плане стаялі,*
*Будынкі ад фарбаў і сонца заззялі*[64].

Разам з пасляваенным аднаўленнем народнай гаспадаркі, аднавілася партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва літаратурай і яго найважнейшы інструмент у выглядзе Саюза пісьменнікаў. Ад сяброў саюза патрабавалі ствараць простыя паводле мовы і адназначныя паводле сэнсу рэчы, прычым у планавым парадку. Так, у маі 1946 г. на партсходзе Саюза пісьменнікаў, дзе абмяркоўваўся «сталінскі» пяцігадовы план аднаўлення гаспадаркі, К. Крапіва заявіў: «У пяцігадовым плане не запісана, колькі раманаў ці паэм мы павінны напісаць. Але гэта не значыць, што нам не трэба планаваць сваю работу»[65].

[63] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 47. Спр. 59. Арк. 1–13, 43.
[64] Калачынскі М., *Незабыўны дзень,* „Полымя” 1951, nr 12, с. 3.
[65] *Пісьменнікі абмяркоўваюць пяцігадовы план,* „ЛіМ” 1946, nr 15, с. 3.

Акрамя партсходаў саюза, ідэялагічнае выхаванне праводзілася на агульных рэспубліканскіх сходах пісьменнікаў. На іх партыйнае кіраўніцтва давала ацэнку працы мастацкай інтэлігенцыі, вызначала патрабаванні да яе далейшай дзейнасці. На першым пасляваенным сходзе, які адбыўся ў ліпені 1947 г. загадчык аддзела літаратуры і мастацтва Кіраўніцтва агітацыі і прапанды ЦК КП(б)Б І. В. Гутараў адкрыта патрабаваў ад пісьменнікаў пісаць творы пра Сталіна[66].

Важнай задачай другой паловы 1940-х гг. заставалася саветызацыя пісьменнікаў заходніх абласцей БССР. З гэтай мэтай для іх праводзіліся разнастайныя выхавальніцкія мерапрыемствы, у тым ліку нарады. На першай з іх, якая прайшла з 16 па 20 мая 1947 г. у Брэсце, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры АН БССР В. В. Барысенка прачытаў даклад «Ленін і Сталін аб літаратуры»[67].

Палітычныя культы, у падмурку якіх палягала сакралізацыя дзеючых правадыроў, прадукавалі літаратурныя культы класікаў-сучаснікаў. Неўзабаве пасля трагічнай смерці Я. Купалы, прапагандысты вырашылі выкарыстаць яго вобраз як прапагандысцкі рэсурс. Да пятых угодкаў смерці, у музеі песьняра былі наладжаны чытанні на тэму «Вобраз таварыша Сталіна ў паэзіі Янкі Купалы "Аб Сталіне мудрым я песні спяваю"»[68]. Пасмяротны вобраз паэта мэтанакіравана зnітоўваўся ў масавай свядомасці з вобразам дыктатара, якому «паэт-грамадзянін лічыў сваім абавязкам дапамагаць у вялікай пераўтваральнай рабоце»[69].

Найважнейшым выхаваўчым мерапрыемствам перыяду позняга сталінізма быў другі з'езд пісьменнікаў Савецкай Беларусі, які праходзіў на фоне пошукаў «бязродных касмапалітаў»

---

[66] *Рэспубліканскі сход пісьменнікаў Беларусі,* „ЛіМ" 1947, nr 30, с. 1.

[67] *Нарада маладых пісьменнікаў заходніх абласцей БССР,* „ЛіМ" 1947, nr 21, с. 1.

[68] *Напярэдадні 5-й гадавіны з дня смерці Янкі Купалы,* „ЛіМ" 1947, nr 24, с. 3.

[69] Клімковіч М., *Вобраз І. В. Сталіна ў паэзіі Янкі Купалы,* „Беларусь" 1949, nr 6, с. 22.

у асяроддзі творчай інтэлігенцыі. 20 чэрвеня 1949 г. з'езд адкрыў двойчы лаўрэат сталінскай прэміі, старшыня Саюза пісьменнікаў БССР П. Броўка, які агучыў думку Сталіна пра тое, што пісьменнікі ўласнымі творамі павінны праектаваць «новага савецкага чалавека». Запрошаны на з'езд лаўрэат шасці сталінскіх прэмій, намеснік генеральнага сакратара Саюза пісьменнікаў СССР К. Сіманаў дэталізаваў гэтую думку, назваўшыя канкрэтныя палітычныя задачы, якія стаялі перад беларускай літаратурай[70]. Былы старшыня саюза М. Клімковіч, ацэніваючы здабыткі айчыннага прыгожага пісьменства, падкрэсліў, што «вобразы правадыроў з'яўляюцца ў нашай літаратуры найбольш багатымі, яркімі і перараканальнымі»[71].

Палітычнае выхаванне пісьменнікаў прадугледжвала не толькі правядзенне з імі прапагандыска-тлумачальнай працы, але таксама публічных «прапрацовак». Прычым, актыўны ўдзел у стварэнні літаратурнай сталініяны не даваў індульгенцыі прызначаным на ролю ахвяры паэтам. Неўзабаве пасля з'яўлення пастановы ЦК УсеКП(б) ад 14 жніўня 1946 г. «Аб часопісах "Звязда" і "Ленінград"», на ролю беларускай А. Ахматавай была прызначана Э. Агняцвет[72]. Ананімны аўтар пагромнага артыкула, прысвечанага яе творчасці, у прыватнасці, пісаў: «Пустапарожняя лірыка Агняцвет уводзць савецкую моладзь ад сапраўднасці»[73]. Напісанне ў 1947 г. «Песні аб Сталіне»[74], не выратавала К. Буйлу ад прамых абвінавачванняў у нацыяналізме, якія праявіўся ў «замілаванні Беларуссю ў вершах»[75]. У 1952 г. пад жорсткую крытыку за радкі «Беларусь

[70] *Другі з'езд савецкіх пісьменнікаў Беларусі,* „Полымя" 1949, nr 7, с. 114–141.

[71] *Другі з'езд савецкіх пісьменнікаў Беларусі (Дзённік з'езда),* „ЛіМ" 1949, nr 28.

[72] Напярэдадні прыняцця гэтай пастановы Э. Агняцвет неабачліва працавала над перакладамі вершаў А. Ахматавай на беларускую мову.

[73] *Пустапарожняя паэзія,* „Звязда" 1946, nr 191, с. 2.

[74] Буйла К., *Песня аб Сталіне,* „Беларусь" 1947, nr 2, с. 10.

[75] Szczarbatau H., *U palonie skażonych ujaulenniau i archaicznych wobrazau,* „Zwiazda" 1951, nr 1949 z 27 lipca , s. 3.

наша мілая тчэцца. / Тчэ Алеся ў дванаццаць нітоў» трапіў аўтар шэрагу прысвечаных Сталіну вершаў А. Бялевіч[76].

Неўзабаве пасля заканчэння другога з'езда пісьменнікаў, праўленне саюза на чале з П. Броўкам распачало падрыхтоўку да святкавання 70-годдзя Сталіна. Было вырашана адзначыць гэты юбілей правядзеннем агульнага схода пісьменнікаў, канцэрта ў Мінску з уделам лепшых артыстаў, а таксама святочнымі мерапрыемствамі ў абласных цэнтрах рэспублікі. Кожны сябра паэтычнай секцыі саюза ўзяў на сябе абавязак напісаць адмысовы твор да 70-годдзя правадыра[77]. Я. Колас выканаў свае абяцанне, напісаўшы верш «Правадыру народаў», у якім нарэшце пазбавіў Сталіна ад надакучлівага суправаджэння старэйшага правадыра:

*Ты – сцяг перамогі, Ты – сімвал свабоды,*
*Ты – дружба народаў, Ты – мір,*
*Жыві-ж Ты, настаўнік наш, многія годы,*
*Цябе праслаўляюць у песнях народы, -*
*Адзіны (sic!) Ты наш правадыр!*[78]

М. Танк у юбілейным вершы распавядаў пра Сталіна жыхарам Татраў – гуралям («Ён гэткі, як сказ ваш ці песня, якую складаеце вы»)[79]. М. Калачынскі пераносіў чытача ў прыгарад Ржэва, у дом, дзе ў жніўні 1943 г. спыняўся Вярхоўны галоўнакамандуючы падчас яго адзінага прыезду на фронт, каб «цяжкую салдацкую долю падзяліць папалам»[80].

Юбілей правадыра быў добрай нагодай падвесці першыя вынікі стварэння беларускай літаратурнай сталініяны. Гэта было даручана зрабіць аднаму са сталінскіх лаўрэатаў М. Лынькову, які ранжыраваў усіх паэтаў у выглядзе трохпрыступкавай піраміды. На верхняй

[76] Бур'ян Б., *На шляху жыццёвай праўды,* „ЛіМ" 1952, nr 24, с. 3.
[77] *Да 70-годдзя з дня нараджэння вялікага Сталіна,* „ЛіМ" 1949, nr 51, с. 1.
[78] Колас Я., *Правадыру народаў,* „Полымя" 1949, nr 12, с. 25.
[79] Танк М., *Песня пра Сталіна,* „Полымя" 1949, nr 12, с. 30.
[80] Калачынскі М., *Хата ў Радоле,* „Полымя" 1949, nr 12, с. 31.

прыступцы знаходзіліся належыўшыя да аднаго пакалення з правадыром класікі – Я. Купала і Я. Колас, творы якіх характарызаваліся найвышэйшай дасканаласцю[81]. Сярэдні прыступак займалі народжаныя ў 1900-х – пачатку 1910-х гг. і дэбютаваўшыя ў часы беларусізацыі П. Броўка, П. Глебка, М. Лужанін, А. Русак, А. Куляшоў, а таксама М. Танк. Падмурак піраміды ўтваралі літаратурныя навабранцы 1930-х гг. – П. Панчанка, В. Вітка, К. Кірыенка, А. Вялюгін, Э. Агняцвет, А. Зарыцкі, А. Астрэйка, М. Калачынскі, М. Аўрамчык і інш[82]. Унёсак у паэтычную сталініяну прадстаўнікоў апошняй генерацыі быў рознага, часта прымітыўнага ўзроўню. Напрыклад, А. Бялевіч павіншаваў Сталіна з 70-годдзем вершам «Сонца», патлумачыўшы яго прымітывізм падзагалоўкам «па народных матывах»: «Мы сонцам вялікім сагрэты / Вядзе яно ў радасны век, / А Сталін наш – сонца ёсць гэта, / Мудрэйшы з людзей чалавек»[83].

Па-ранейшаму складанасці існавалі з увасабленнем вобраза дыктатара ў прозе. На думку Я. Пламера, Сталін ніколі не з'яўляўся галоўным героем савецкіх раманаў таму, што сацрэалістычны канон патрабаваў, каб герой пераўтвараўся ў «новага савецкага чалавека» у выніку развіцця, пераадолення разнастайных перашкод на шляху ўласнага перараджэння. Аднак, Сталіна немагчыма было паказаць у працэсе развіцця, бо ён, як недасяжны ідэал, простаў «быў», знаходзячыся па-за часам і прасторай[84].

Тым не менш, празаікі спрабавалі зрабіць правадыра прынамсі ўскосным удзельнікам сюжэтных ліній. У рамане І. Мележа «Мінскі напрамак» салдат натхняе на вясеннее наступленне 1944 г. выступ вярхоўнага галоўнакамандуючага па радыё. Падобны прыём

[81] У Я. Купалы гэта былі вершы «Аб Сталіне – сейбіту», «Табе, правадыр…», «Я Сталіну мудраму песню спяваю…», у Я. Коласа – «Вялікаму Сталіну», «Правадыру і настаўніку», «Першы дэпутат».

[82] Лынькоў М., *Дарагі вобраз,* „Звязда" 1949, nr 249, с. 3–4.

[83] Бялевіч А., *Сонца,* „Звязда" 1949, nr 250, с. 3.

[84] Я. Пламппер, *Алхимия власти. Культ Сталина в изобразительном искусстве*, Москва 2010, с. 8.

выкарыстаў І. Шамякін у рамане «Глыбокая плынь», а таксама М. Лупсякоў у апавяданні «Слова правадыра». Гераіня паэтычнай аповесці Т. Хадкевіча «Вяснянка» убачыла Сталіна ў «цудоўным сне», калгасніца Зося ў рамане А. Стаховіча «Пад мірным небам» вышыла для яго рушнік[85].

Пачынаючы з 1939 г. галоўным сведчаннем поспеху савецкіх літаратараў, а таксама дзеячаў навукі, тэхнікі і мастацтва зрабілася наяўнасць у іх прэміі імя Сталіна[86]. 15 сакавіка 1941 г. з'явіліся першыя пяць беларускіх сталінскіх лаўрэатаў, у тым ліку Я. Купала, атрымаўшы прэмію першай ступені за зборнік вершаў «Ад сэрца» і К. Крапіва, узнагароджаны прэміяй другой ступені за п'есу «Хто смяецца апошнім». Словы падзякі правадыру ад усіх беларускіх лаўрэатаў даручылі сказаць Я. Купалу:

*Дзякуй за годнасць паэта народнага,*
*Дзякуй за Леніна ордэн мне радасны,*
*Дзякуй за прэмію Сталіна роднага,*
*Дзякую Сталіну, сокалу яснаму!*

У 1946 г. рашэннем СНК СССР Сталінская прэмія першай ступені была прысуджана Я. Коласу за вершы «Салар», «Голас зямлі», «На захад», «Майму другу», «Родны шлях», «У майскія дні», «Да-

[85] Лынькоў М. Ц., *Вобраз Сталіна ў беларускай мастацкай літаратуры,* Мінск 1950, с. 21.

[86] Прэміі імя Сталіна першай, другой и трэцяй ступеняў для дзеячаў навукі, літаратуры і мастацтва былі заснаваны 20 снежня 1939 г. у гонар 60-гадовага юбілея правадыра ў памеры 100, 50 и 25 тыс. рублёў адпаведна (сярэднемесячны заробак у СССР у той час складаў каля 350 рублёў). Фармальна рашэнні аб узнагародах прымаў Камітэт па сталінскім прэміям, але апошняе слова заўсёды заставалася за Сталіным. Акрамя фінансавага дабрабыту і сацыяльнага прэстыжу, узнагарода, як правіла, давала яе ўладальнікам гарантыю асабістай недатыкальнасці, а іх творы аўтаматычна ўваходзілі ў сацрэалістычны канон. Акрамя прэмій імя Сталіна, пастанова СНК СССР ад 20 снежня 1939 г. уводзіла сталінскія стыпендыі для студэнтаў ВНУ, аспірантаў і дактарантаў. Адным з першых беларускіх сталінскіх стыпендыятаў у красавіку 1940 г. стаў студэнт гістарычнага факультэта БДУ Л. С. Абэцэдарскі.

рогай славы» і А. Куляшову за паэму «Сцяг брыгады». У 1949 г. абодвы пісьменнікі атрымалі яшчэ па адной сталінскай прэміі, на гэты раз другой ступені, за паэмы «Рыбакова хата» і «Новае рэчышча»[87]. У 1947 г. прэміяй другой ступені быў адзначаны паэма «Хлеб», а таксама вершы «Думы пра Маскву», «Брат і сястра», «Народнае дзякуй», «Каб мне стаяць…», «Спатканне» П. Броўкі, у наступным годзе – паэтычны зборнік М. Танка «Каб ведалі»[88]. У 1951 г. – прэміяй трэцяй ступені Сталін узнагародзіў п'есу К. Крапівы «Пяюць жаваранкі», зборнік вершаў П. Броўкі «Дарогі жыцця» і раман І. Шамякіна «Глыбокая плынь», у 1952 г. – прэміяй трэцяй ступені аповесць Я. Брыля «У Забалоцці днее». Кожны беларускі пісьменнік, адкрыта ці прыхавана, жадаў атрымаць сталінскую прэмію, і падобным чынам трапіць у эліту савецкага грамадства. Здзяйсненне запаветнай мары ў некаторых выклікала нечакана змешаныя пачуцці. У дзень уручэння вышэйшай літаратурнай узнагароды М. Танк пакінуў наступны запіс у сваім дзённіку: «Усе віншуюць, а мне аж страшна. Трэба будзе яшчэ лепш і лепш пісаць, вучыцца і вучыцца…»[89].

Напачатку 1950-х гг. паэты пачалі адлюстроўваць у сваіх творах новыя рысы прапагандысцкага вобразу правадыра – дойліда камунізма, вялікага вучонага, сцяганосца міру. З мэтай распрацоўцы і прапаганды апошняй міфалагемы, Беларускае дзяржаўнае выдавецтва ў 1950 г. надрукавала адмысловы паэтычны зборнік пад назвай «На варце міру». Яго канцэпцыю сфармуляваў Я. Колас: «Няхай вар'яцеюць апосталы вайнаў / А нас не пужае іх хор непрыстойны – / Ёсць Сталінскі геній. Мы з ім»[90].

[87] Агіевіч Ул., *Толькі з пазіцый жыцця (Думкі аб паэзіі 1948 года),* „Беларусь" 1949, nr 5, с. 10–14.

[88] Клімковіч М., *З песняй барацьбы,* „Беларусь" 1948, nr 5, с. 12–15.

[89] *Максім Танк.*, Укл. С. У. Калядка, Мінск 2014, с. 67.

[90] *На варце міру: творы, прысвечаныя барацьбе за мір,* Скл. А. Вялюгін, Мінск 1950, с. 6.

Сталінскі перыяд беларускай паэзіі падсумаваў паэтычны зборнік «Ад шчырага сэрца», выйсце якога было прымеркавана да адкрыцця ў верасні 1952 г. XX з'езда КП(б)Б. Структурна зборнік складаўся з дзвюх раздзелаў. У першым раздзеле былі собраны ўсе паэтычныя лісты Сталіну ад беларускага народа, у другім – лепшыя творы трыццаці двух беларускіх паэтаў, прысвечаныя правадыру. «Лепшы сябра пісьменнікаў Беларусі» параўноўваўся ў іх з сонцам, з імклівай сілай паўнаводных рэк, з празрыстасцю крыніц, з красаваннем палёў і садоў, з вясной. А. Вялюгіну каханне да правадыра дапамагло пераадолець галоўны чалавечы страх – страх смерці: «Гатоў я ў песнях згарэць прамяніста, / У бітве апошняй памерці ад ран, / Каб толькі жыццё маё кропляю чыстай / У Ваша ўлілося, нібы ў акіян»[91].

У набліжэнні смерці Сталіна ў паэзіі ўсё часцей гучаў матыў яго няўміручасці. Напрыклад, І. Муравейка так пажадаў несмяротнасці свайму куміру: «Колькі ў небе свеціць зорак / Над усёй зямлёй вялізнай, / Столькі год жыве хай Сталін, / Сталін – сонца Комунізма!»[92]. Канешне, ніякія паэтычныя загаворы не маглі спыніць бега часу. Тым не менш, і пасля скону дыктатара, беларускія паэты нібыта імкнуліся пераадолець законы жыцця і смерці. Гэтым жаданнем былі прасякнуты вершы П. Глебкі, М. Лужаніна, А. Вялюгіна, М. Танка, Э. Агняцвет, К. Буйлы, А. Астрэйкі, Э. Валасевіча, Н. Тарас, Б. Лунькова, напісаныя ў жалобныя сакавіцкія дні 1953 г. Я. Колас тады па-прароцку напісаў: «Ды ты жывеш з намі і вечна / Жыць будзеш у сэрцы народа, / Твой скарб з намі будзе заўсёды, / Як самы святы, чалавечны»[93].

Міжволі паўстае пытанне, наколькі шчырымі былі шматлікія вершаваныя панегірыкі, напісаныя на адрас правадыра? Можна выказаць меркаванне, што большасць з іх была вынікам сацыяль-

[91] *Ад шчырага сэрца: зборнік вершаў беларускіх паэтаў, прысвечаных І. В. Сталіну*, Рэд. П. Броўка, Менск 1952, с. 181.

[92] Муравейка І., *Колькі ў небе зорак ясных,* „Беларусь" 1951, nr 2, с. 20.

[93] Колас Я., *Бацьку і настаўніку,* „Полымя" 1953, nr 3, с. 6.

най замовы ўлады, якой адпавядала натуральнае жаданне творцы быць пачутым, друкаваць свае творы. Трапіць у кола абраных, каму дазвалялася апавянне праведыра, азначала далучэнне да сталінскай творчай эліты з усімі яе прывілеямі. М. Шчаглоў-Куліковіч так апісваў адпраўку беларускай дэлегацыі на дэкаду беларускай літаратуры ў Маскве ў 1939 г.:

> Станцыя Менск. Адсюль каля 11-ае гадзіны ўвечары штодня адыходзіць кур'ерскі цягнік на Маскву. Хай у Саветах усе роўныя, няма ні багатыроў, ні бедматы, але цягнік гэты не для звычайных грамадзянаў шчасьлівае краіны Саветаў. Яны да яго не пасуюць ані кішэняй, ані выглядам. У ім езьдзяць звычайна партыйныя й савецкія кіраўнікі ды савецкая "галоўка". Мяккія вагоны, рэстаран… Што зажадаеш – усё пад рукой; адно спытай – усё, калі ласка. У гэты вечар на станцыі – натоўп. І ўсё больш "багема" – пісьменьнікі, маляры, кампазытары, акторы. Яны выпраўляюць у Маскву на "Тыдзень беларускае літаратуры" сваю беларускую дэлегацыю[94].

Значная колькасць беларускіх літаратараў адрасавала свае словы «лепшаму сябру» ад сэрца. Сталін валодаў выдатнымі акторскімі здольнасцямі, якія дазвалялі зачароўваць патрэбнага чалавека, выклікаць у яго шчырае захапленне. Ён добра разумеў асаблівасці псіхалогіі пісьменніка, такія як амбіцыйнасць, эмацыйнасць, схільнасць да самападману і гуляў на іх. Нарэшце ён меў асабістую прыцягальнасць, якую адчувалі нават дасведчаныя людзі. Напрыклад, М. Танк да канца жыцця лічыў уласны зборнік «Каб ведалі» вельмі ўдалым[95], П. Броўка не жадаў асуджаць культ асобы нават пасля XX з'езда КПСС[96], А. Куляшоў да канца жыцця захоўваў пар-

[94] *Янка Купала і Якуб Колас. 1882–1982. Вянок успамінаў пра іх*, Укл. і рэд. А. Калубовіч, Гранд Рапідс 1982, с. 67.

[95] *Максім Танк.*, Укл. С. У. Калядка, Мінск 2014, с. 438.

[96] Пра гэта сведчыць наступны фрагмент ліста Я. Коласа П. Броўку, напісанага 8 ліпеня 1956 г.: «Вельмі шкада, што не пераадолелі "культ личности" раней, калі быў жывы сам "культар". Тлумачэнне, што тады нельга было пераадольваць, не пераканаўчае: ці мог стаяць высока ў вачах народа чалавек, які ўзяў на знішчэнне

трэт Сталіна ў асобнай тэчцы разам з партрэтамі любімых жачын[97], а К. Крапіве не падабалася антысталінскія сцэнічныя інтэпрэтацыі яго п'есы «Хто смяецца апошнім»[98].

Нарэшце, ва ўлады быў яшчэ адзін праверaны спосаб абудзіць у творцаў высокія пачуцці да правадыра, а менавіта гвалт. Напрыклад, 3 ліпеня 1939 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка пісаў сакратару ЦК УсеКП(б) Г. М. Малянкову:

> Кадры пісьменнікаў, мастакоў, скульптараў, артыстаў саспытвалі на сябе дзікія хуліганскія адносіны. У сярэдзіне 1938 г. яны былі ў стане творчай пасіўнасці, маральнай падаўленасці. Пісьменнікі і найбольш знакамітыя артысты дайшлі да таго, што літаральна гадалі – хто з іх будзе наступны арыштаваны[99].

Адзінкі, лічучы сталінскія панегірыкі «дрындушкамі», дазвалялі сабе крытыку «бацькі народаў». Я. Купала, які ў 1930 г. прадэманстраваў свае стаўленне да «вялікага пераломy» неўдалай спробай суіцыда, наступным чынам ацэньваў савецкае адступленне 1941 г.: «Гэта вусаты вінаваты»[100]. Сын Я. Коласа – Д. Міцкевіч узгадваў, як прыкладна ў 1932 г. яго бацька з пачуццем прамовіў: «Як бы я хацеў, як бы я радаваўся, каб гэты вусаты гойдася на шыбеніцы»[101]. Паводле парады сяброў, а таксама са страху за дзяцей, за жонку,

---

і здзек амаль па чалавеку з кожнай сям'і савецкіх людзей? Аўтарытэт яго быў штучны, узгадаваны на грунце страху за сваё жыццё, за свой дабрабыт. І мы так напалоханы, што не адважваемся адкрыта гаварыць пра гэта і цяпер. І, напэўна, ты, перачытваючы гэтыя радкі, ускінеш плечы, нахмурышся і падумаеш: "І навошта ён піша так?"». *Якуб Колас. Збор твораў у 20 тамах. Т. 20. Лісты 1954–1956 гг.,* Мінск 2012, с. 153.

[97] Куляшова В. А., *Лясному рэху праўду раскажу…,* Мінск 1989, с. 13.

[98] Пазьняк З., *Зацемкі зь мінулага часу // Беларус: літаратурны альманах беларускіх пісьменнікаў замежжа,* Нью Ёрк 2018, с. 80.

[99] Платонаў Р. П., *Старонкі гісторыі Беларусі. Архівы сведчаць: з навуковай спадчыны,* Мінск 2002, с. 275.

[100] Інтэрв'ю аўтара з даследчыкам-капалазнаўцам, ганаровым старшынёй Міжнароднага фонду Янкі Купалы, прафесарам В. П. Рагойшам.

[101] Міцкевіч Д., *Любіць і помніць,* Мінск 2000, с. 59.

за сябе, у 1949 г. Я. Брыль спаліў уласныя крамольныя запісы, дзе былі «цьвярозыя думкі пра культ асобы»[102]. У 1936 г. пяцігадовы тэрмін зняволення ў ГУЛАГу атрымаў таленавіты 20-гадовы паэт М. Гваздоў, які публічна жартаваў над Сталіным[103]. А. Бабарэка крытыкаваў тэзіс Сталіна аб тым, што знішчэнне класаў дасягаецца не шляхам затухання, але абвастрэння класавай барацьбы[104].

* * *

На мяжы 1920-х – 1930-х гг. працэс развіцця беларускай нацыянальнай літаратуры быў штучна спынены агрэсіўнай спробай рэалізацыі наднацыянальнага таталітарнага праекта. Цалкам падпарадкаваная дзяржаўнай ідэалогіі, гэтая культура ўжо на пачатковым этапе свайго існавання знішчыла дух творчасці і набыла застылыя формы. Увасабленне на практыцы галоўных прынцыпаў сацрэалізма – партыйнасці, ідэйнасці, народнасці нараджала творы, якім былі ўласцівы прымітыўнасць думкі, шаблоннасць вобразаў, стандартнасць кампазіцыйных рашэнняў, натуралістычнасць формы. Працэс прадукавання «культавых» твораў быў амаль пазбаўлены індывідуальнага, творчага кампанента, ён ішоў у рэчышчы квазісакральнага канону. Гэтыя працэсы кантраляваліся Аддзелам прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б, Упраўленнем па справах мастацтва, творчымі саюзамі, Галоўітам, нарэшце, органамі НКУС. Улада патрабавала ад творцы стварэння савецкага міфа, у цэнтры якога знаходзіўся Сталін. Запыт на міфалагізацыю дасягнуў сваёй вышэйшай кропкі на пачатку 1950-х гг., у зеніце яго праўлення, калі, як у часы Візантыі, галоўнай рысай партрэта правіцеля з'яўлялася не падабенства, але ідэалізаваны вобраз, сімвал таго, чым з'яўлялася мадэль.

[102] Брыль Я., *Вячэрняе. Лірычныя запісы і мініяцюры,* Мінск 1994, с. 4, 29.

[103] *Расстраляная літаратура*, Укл. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі, Мінск 2008, с. 643.

[104] Babareka A.A., *Zauwahi da dakladu I. Stalina ab „procilehlych paczatkach”* [w:] Babareka A.A., *Zbor tworau,* t. 2, Wilno-Białystok 2011, s. 181–182.

## Bibliografia

*Ad shchyraha serca: zbornik vyershau belaruskikh paetau, prysvechanykh I.V. Stalinu,* red.: P. Brouka, Minsk 1952 [*Ад шчырага сэрца: зборнік вершаў беларускіх паэтаў, прысвечаных І. В. Сталіну*, Рэд. П. Броўка, Менск 1952].

*Ad usyaho serca*, „Polymya" 1949, nr 1 [*Ад усяго сэрца,* „Полымя" 1949, nr 1].

Ahiyevich U, *Tolki z pazitsyi zhytsia (Dumki ab paezii 1948 hoda),* „Belaruś" 1949, nr 5 [Агіевіч Ул., *Толькі з пазіцый жыцця (Думкі аб паэзіі 1948 года),* „Беларусь" 1949, nr 5].

Alyeksandrovich A., *Pesnia proletarskaha yadnannya,* „LiM" 1934, nr 3 [Александровіч А., *Песня пролетарскага яднання,* „ЛіМ" 1934, nr 3].

Alyeksandrovich A., *Pismenniki Byelaruskaj SSR, delehaty pershaha usyesay-uznaha zyezda – tavaryshu Stalinu,* „LiM" 1934, nr 46 [Александровіч А., *Пісьменнікі Беларускай ССР, дэлегаты першага ўсесаюзнага з'езда – таварышу Сталіну,* „ЛіМ" 1934, nr 46].

Babareka A.A., *Zauvahi da dakladu I. Stalina ab „protsilehlyhh pachatkakh"* [u:] Babareka A.A., *Zbor tvorau,* t. 2, Wilnya-Byelastok 2011 [Бабарэка А. А., *Заўвагі да дакладу І. Сталіна аб «процілеглых пачатках»* [у:] Бабарэка А. А., *Збор твораў,* Вільня-Беласток 2011].

Barashka I., *Aspinstan. Narys,* Minsk 1931 [Барашка І., *Асінстан. Нарыс,* Мінск 1931].

Barysienka V., *Vobraz vyalikaha pravadyra u belaruskay litaratury,* „Polymya revalutsyi" 1939, nr 11–12 [Барысенка В., *Вобраз вялікага правадыра ў беларускай літаратуры,* „Полымя рэвалюцыі" 1939, nr 11–12].

Branshteyn J., *Partyya kankretna kiruye,* „LiM" 1934, nr 3 [Бранштэйн Я., *Партыя канкрэтна кіруе* „ЛіМ" 1934, nr 3.]

Bryl Y., *Viachernyaye. Lirycynyya zapisy i miniyatsury,* Minsk 1994 [Брыль Я., *Вячэрняе. Лірычныя запісы і мініяцюры,* Мінск 1994].

Buryan B., *Na shlakhu zhytsiovay praudy,* „LiM" 1952, nr 24 [Бур'ян Б., *На шляху жыццёвай праўды,* „ЛіМ" 1952, nr 24].

Buyla K., *Pesnya ab Stalinye,* „Belaruś" 1947, nr 2 [Буйла К., *Песня аб Сталіне,* „Беларусь" 1947, nr 2].

Byalevich A., *Sontsa,* „Zviazda" 1949, nr 250 [Бялевіч А., *Сонца,* „Звязда" 1949, nr 250].

Chykun P., *Sunduk-unikum,* „Zvyazda" 1936, nr 268 [Чыкун П., *Сундук-унікум*, „Звязда" 1936, nr 268].

*Da 70-hoddzya z dnia naradzhennya vyalikaha Stalina,* „LiM" 1949, nr 51 [*Да 70-годдзя з дня нараджэння вялікага Сталіна,* „ЛіМ" 1949, nr 51].

*Druhi zyezd sovetskikh piśmennikau Belarusi (Dzyonnik zyezda),* „LiM" 1949, nr 28 [*Другі з'езд савецкіх пісьменнікаў Беларусі (Дзённік з'езда),* „ЛіМ" 1949, nr 28].

*Druhi zyezd sovetskikh piśmiennikau Belarusi,* „Polymya" 1949, nr 7 [*Другі з'езд савецкіх пісьменнікаў Беларусі,* „Полымя" 1949, nr 7].

Dudar Al., *Vorahi*, „Polymya revalutsyi" 1936, Kn. 8 [Дудар Ал., *Ворагі,* „Полымя рэвалюцыі" 1936, Кн. 8].

*Dwanatsać pesien pra nahzu nyepyeramozhnuyu Chyrvonuyu Armiyu i yaye tvartsa i natchnyalnika vialikaha Stalina, pra yaye palkavodtsa Klimyenta Varashylava, pra hyeraichnyya pakhody i bitvy, pra muzhnast' synou Byelaruskay zyamli, pra nadzyeynuyu vartu savyestkikh hranits, pra yednasts narodu i armii, pra nashykh shchaslivykh i smyelykh dziatsyey, pra nashu stalinskuyu radasnuyu moladz,– napisali Yanka Kupala, Yakub Kolas, Andrey Alyeksandrovich, Pyatruś Brouka, Pyatro Hlyebka, – prysviachayutsa slaunay Rabocha-Syalyanskay Chyrvonay Armii i yaye pravadyru – pyershamu marshalu Krainy Sotsyyalizma Klimyentu Yefremavichu Varashylavu,* „Zvyazda" 1936, nr 209 [*Дванаццаць песень пра нашу непераможную Чырвоную Армію і яе тварца і натхняльніка вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Клімента Варашылава, пра гераічныя паходы і бітвы, пра мужнасць сыноў Беларускай зямлі, пра надзейную варту савецкіх граніц, пра еднасць народу і арміі, пра нашых шчаслівых і смелых дзяцей, пра нашу сталінскую радасную моладзь, – напісалі Янка Купала, Якуб Колас, Андрэй Александровіч, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, – прысвячаюцца слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і яе правадыру – першаму маршалу Краіны Соцыялізма Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву,* „Звязда" 1936, nr 209].

Gromov Ye., *Stalin: iskustvo i wlast',* Moskva 2003 [Громов Е., *Сталин: искусство и власть,* Москва 2003].

*Hramafonny zapis narodnykh pyesiyn,* „LiM" 1936, nr 70 [*Грамафонны запіс народных песень,* „ЛіМ" 1936, nr 70].

Kalachynski M., *Chata и Radole,* „Polymya" 1949, nr 12 [Калачынскі М., *Хата ў Радоле,* „Полымя" 1949, nr 12].

Kalachynski M., *Narodny Stalin*, „LiM" 1939, nr 19 [Калачынскі М., *Народны Сталін,* „ЛіМ" 1939, nr 19].

Kalachynski M., *Niezabyuny dzien',* „Polymya" 1951, nr 12 [Калачынскі М., *Незабыўны дзень,* „Полымя" 1951, nr 12].

Kalubovich A., *Kroki historii,* Byelastok-Vilnya-Myensk 1993 [Калубовіч А., *Крокі гісторыі,* Беласток-Вільня-Менск 1951].

Karatkyevich A., *Padarunak kalhasniku Arlovu,* „Zvyazda" 1937, nr 52 [Караткевіч А., *Падарунак калгасніку Арлову,* „Звязда" 1937, nr 52].

Kiryyenka K., *Vyelichnyya vobrazy,* „LiM" 1952, nr 25 [Кірыенка К., *Велічныя вобразы,* „ЛіМ" 1952, nr 25].

Klimovich M., *Sovyetskaya litaratura Byelarusi,* „Chyrvonaya zmyena" 1934, nr 188 [Клімковіч М., *Савецкая літаратура Беларусі,* „Чырвоная змена" 1934, nr 188].

Klimovich M., *Vobraz I.V. Stalina u paezii Yanki Kupaly,* „Byelaruś" 1949, nr 6. [Клімковіч М., *Вобраз І. В. Сталіна ў паэзіі Янкі Купалы,* „Беларусь" 1949, nr 6.]

Klimovich M., *Z pyesnyay baratsby,* „Byelarus'" 1948, nr 5 [Клімковіч М., *З песняй барацьбы,* „Беларусь" 1948, nr 5].

Kolas Y., *Batsku i nastauniku,* „Polymya" 1953, nr 3 [Колас Я., *Бацьку і настаўніку,* „Полымя" 1953, nr 3].

Kolas Y., *Pravadyru narodau,* „Polymya" 1949, nr 12 [Колас Я., *Правадыру народаў,* „Полымя" 1949, nr 12].

Kulyashova V.A., *Lyasnomu rekhu praudu raskazhu…,* Minsk 1989 [Куляшова В. А., *Лясному рэху праўду раскажу…,* Мінск 1989].

Larchanka M. H., *Ab ramane „Buduchynya" E. Samuylonka,* „Zvyazda" 1938, nr 201 [Ларчанка М. Г., *Аб рамане «Будучыня» Э. Самуйлёнка,* „Звязда" 1938, nr 201].

Lynkou M., *Darahi vobraz,* „Zvyazda" 1949, nr 249 [Лынькоў М., *Дарагі вобраз,* „Звязда" 1949, nr 249].

Lynskou M. Ts., *Vobraz Stalina u byelaruskay mastatskay litaratury,* Minsk 1950 [Лынькоў М. Ц., *Вобраз Сталіна ў беларускай мастацкай літаратуры,* Мінск 1950].

*Maksim Tank*, red.: S.U. Kalyadka, Minsk 2014 [*Максім Танк*., Укл. С. У. Калядка, Мінск 2014].

Mashara M., *Tawaryhzu Stalinu,* „Zvyaza", 1939, nr 254 [Машара М., *Таварышу Сталіну*, „Звязда" 1939, nr 254].

Miedzyalcou A., *Natallya Arsyenyeva praz uspaminy Piatra Krauchanki*, „Rehiyanalnaya hazeta" 2016, nr 5 [Медзяльцоў А., *Наталля Арсеннева праз успаміны Пятра Краўчанкі*, „Рэгіянальная газета" 2016, nr 5] .

Mitskyevich D., *Lubits i pomnits,* Minsk 2000 [Міцкевіч Д., *Любіць і помніць,* Мінск 2000].

Muravyeyka I., *Kolki u nyebye zorak yasnykh,* „Byelaruś" 1951, nr 2 [Муравейка І., *Колькі ў небе зорак ясных,* „Беларусь" 1951, nr 2].

*Muzyka da tekstu piśma byelaruskaha narodu vialikamu Stalinu,* „Zvyazda" 1936, nr 208 [*Музыка да тэксту пісьма беларукага народу вялікаму Сталіну,* „Звязда" 1936, nr 208].

*Na vartsye miru: twory, prysvechanyya baratsbe za mir,* red.: A. Vyaluha, Minsk 1950 [*На варце міру: творы, прысвечаныя барацьбе за мір,* Скл. А. Вялюгін, Мінск 1950].

*Napyaredadni 5-y hadaviny z dnya smyersti Yanki Kupaly,* „LiM” 1947, nr 24 [*Напярэдадні 5-й гадавіны з дня смерці Янкі Купалы,* „ЛіМ” 1947, nr 24].

*Narada maladykh pismyennikau zakhodnikh ablastsey BSSR,* „LiM” 1947, nr 21 [*Нарада маладых пісьменнікаў заходніх абласцей БССР,* „ЛіМ” 1947, nr 21].

Natsyyanalny arkhiu Respubliki Byelaruś (NARB). F 4p. Vop. 1 [Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1].

Panchanka P., *Hordasts nashay paezii,* „LiM” 1946, nr 5 [Панчанка П., *Гордасць нашай паэзіі*, „ЛіМ” 1946, nr 5].

Paznyak Z., *Zatsemki z minulaha chasu* [w:] *Byelaruś: litaraturny almanakh byelaruskikh pismyennikau zamyezhzha,* New York 2018 [Пазьняк З., *Зацемкі зь мінулага часу // Беларус: літаратурны альманах беларускіх пісьменнікаў замежжа,* Нью Ёрк 2018].

*Pismo byelaruskaha naroda vialikamu STALINU,* „LiM” 1936, nr 43 [*Пісьмо беларускага народа вялікаму СТАЛІНУ,* „ЛіМ” 1936, nr 43].

*Pismo chuvashskogo naroda velikomu Stalinu,* Tseboskary 1937 [*Письмо чувашского народа великому Сталину,* Чебоксары 1937].

*Pismo kamsamoltsau i moladzi Byelarusi tavaryshu Stalinu u dzyen 25-y hadaviny LKSMB,* „LiM” 1945, nr 19 [*Пісьмо камсамольцаў і моладзі Беларусі таварышу Сталіну ў дзень 25-й гадавіны ЛКСМБ,* „ЛіМ” 1945, nr 19].

*Pismo pratsounykh Sovyetskay Hruzii pravadyru narodau vyalikamu Stalinu,* „LiM” 1936, nr 17 [*Пісьмо працоўных Савецкай Грузіі правадыру народаў вялікаму Сталіну,* „ЛіМ” 1936, nr 17].

*Pismyenniki abmyarkouvajuts piatsihadovy plan,* „LiM” 1946, nr 15 [*Пісьменнікі абмяркоўваюць пяцігадовы план,* „ЛіМ” 1946, nr 15].

Пламппер Я., *Алхимия власти. Культ Сталина в изобразительном искусстве*, Москва 2010, с. 8

Platonau R.P., *Staronki historyi Byelarusi. Arkhivy svyedczats: z navukovay spadchyny,* Minsk 2002 [Платонаў Р. П., *Старонкі гісторыі Беларусі. Архівы сведчаць: з навуковай спадчыны,* Мінск 2002].

*Podderzhim initiyativu kolkhoznikov Bobrujshchiny,* „Rabochiy” 1936, nr 113 [*Поддержим инициативу колхозников Бобруйщины,* „Рабочий” 1936, nr 113].

„Polymya revalutsyi” 1936, Kn. 8 [Полымя рэвалюцыі, 1936, Кн. 8].

*Pramova tav. Kisyalyoyay,* „LiM” 1936, nr 68 [*Прамова тав. Кісялёвай*, „ЛіМ” 1936, nr 68].

*Pramova tavarysha N.F. Hikalo*, „LiM" 1936, nr 18 [*Прамова таварыша Н.Ф. Гікало,* „ЛіМ" 1936, nr 18].

*Pryyom u tav. Byeryya,* „Zvyazda" 1935, nr 155 [*Прыём у тав. Берыя,* „Звязда" 1935, nr 155].

*Pustaparozhnyaya paeziya,* „Zvyazda" 1946, nr 191 [*Пустапарожняя паэзія*, „Звязда" 1946, nr 191].

Pyestrak F., Tank M., Mashara M., Klimovich M., *Z twaim imyem u sertsy. Tawaryshu Stalinu,* „LiM" 1940, nr 39 [Пестрак Ф., Танк М., Машара М., Клімковіч М., *З тваім імем у сэрцы. Таварышу Сталіну*, „ЛіМ" 1940, nr 39].

„Rabotnitsa i kalhasnitsa Byelarusi" 1936, nr 1 [“Работніца і калгасніца Беларусі" 1936, nr 1].

*Rasstralyanaya litaratura,* ukl.: L. Savik, M. Skobla, K. Cvirki, Minsk 2008 [*Расстраляная літаратура*, Укл. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі, Мінск 2008].

*Respublikanski skhod pismyennikau Byelarusi,* „LiM" 1947, nr 30 [*Рэспубліканскі сход пісьменнікаў Беларусі,* „ЛіМ" 1947, nr 30].

Shcharbatau H., *U palonye skazhonykh uyaulyennyau i arkhaichnych vobrazau,* „Zvyazda" 1951, nr 1949 [Шчарбатаў Г., *У палоне скажоных уяўленняў і архаічных вобразаў,* „Звязда" 1951, nr 1949].

*Stalin u byelaruskay savyetskay paezii: zbornik,* red.: M. Lyтkou, Minsk 1937 [*Сталін у беларускай савецкай паэзіі: Зборнік*, Рэд. М. Лынькоў, Мінск 1937].

*Stalin u byelaruskay savyeckay paezii,* Minsk 1937 [*Сталін у беларускай савецкай паэзіі,* Мінск 1937].

Tank M., *Pyesnya pra Stalina,* „Polymya" 1949, nr 12 [Танк М., *Песня пра Сталіна,* „Полымя" 1949, nr 12].

Tank M., *Siahonnia,* „Zvyazda" 1939, nr 257 [Танк М., *Сягоння*, „Звязда" 1939, nr 257].

Tsikhanovich J., *Partret stahoddzya,* Minsk 2015 [*Ціхановіч Я., Партрэт стагоддзя,* Minsk 2015].

*Vyalikamu Stalinu ad byelaruskaha naroda,* Minsk 1940 [*Вялікаму Сталіну ад беларускага народа,* Мінск 1940].

*Vyalikamu Stalinu u dzien 70-hoddzya ad byelaruskaha naroda,* „Zvyazda" 1950, nr 1 [*Вялікаму Сталіну ў дзень 70-годдзя ад беларускага народа,* „Звязда" 1950, nr 1].

*Yakub Kolas. Zbor tworau u 20 tamakh*, t. 20, *Listy 1954–1956 hh.,* Minsk 2012 [*Якуб Колас. Збор твораў у 20 тамах. Т. 20. Лісты 1954–1956 гг.,* Мінск 2012].

*Yanka Kupala i Yakub Kolas. 1882–1982. Vyanok uspaminau pra ikh,* red.: A. Kalubovich, Grand Rapids 1982 [*Янка Купала і Якуб Колас. 1882–1982. Вянок успамінаў пра іх*, Укл. і рэд. А. Калубовіч, Гранд Рапідс 1982].

*Zadachy mastatskay litaratury BSSR,* „Chyrvonaya zmyena" 1933, nr 70 [*Задачы мастацкай літаратуры БССР,* „Чырвоная зьмена" 1933, nr 70].

## Stalin in the Soviet Belarusian literature

The study traces the development of the 1930s–1950s fabrication of Stalin as 'a best friend of Belarusian people' and literary icon. The Belarusian Soviet writers constantly praised Stalin, describing as 'Great', 'Beloved', 'Bold', 'Wise', 'Inspirer', and 'Genius'. They portrayed him as a caring yet strong father figure, with the Soviet Belarusian populace as his 'children'. The article shows that Stalin's role as putative 'all-powerful all-knowing leader' was partly the product of a cult of personality, and partly its driving force. New interpretations of a wide range of Stalin-inspired writing in various genres, including poetic letters of 'the Belarusian people' to Stalin, are given in the article. Some of these writing became part of the official canon, and some of them were instantly forgotten. Author's attention to the personality cult literary dissenters is particularly valuable.

Keywords: Belarusian Soviet literature, Stalin's cult of personality, Writers' Union of Soviet Belarus, Congress of Writers, Poetry.